Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 МАЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 99 (27957) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА





Колькі каштуе выпускны?



Еўратур для пяцярых



Замест дома — інтэрнацкі пакой

СТАР. 5

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ірына ДАЎГАЛА, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама:**

*«Эфектыўнымі мерамі для адаптацыі маладых спецыялістаў і замацавання іх на месцах павінны стаць гарантыі наймальніка, вызначаныя калектыўным дагаворам. Менавіта таму ў дакументе трэба прадугледзець усе льготы для гэтай катэгорыі грамадзян: прадастаўленне жылля, устанаўленне нейкіх дадатковых выплат, павышэнне службовых акладаў, дадатковыя дні да адпачынку, кампенсацыя за наём жылля, праезд да месца працы і іншыя».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.05.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14630,00 | ▲ |
| Еўра | 15970,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 288,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 678,89 | ▲ |


ISSN 1990 - 763X


■ Абітурыент—2015

# РЭГІСТРАЦЫЯ НА ЦТ ВЫХОДЗІЦЬ НА ФІНІШ!

**Пытанне — колькі ж сёлета будзе прэтэндэнтаў на студэнцкі білет — хвалюе многіх, прычым не толькі абітурыентаў, але і прадстаўнікоў ВНУ: ці будзе ім з каго выбіраць сабе першакурснікаў? Адказ мы атрымаем зусім хутка — рэгістрацыя ўдзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання завяршаецца праз некалькі дзён.**

На стане на 11 гадзін раніцы 27 мая сваё жаданне ўдзельнічаць у прыёмнай кампаніі афіцыйна афармілі ў пунктах рэгістрацыі каля 77,5 тысячы чалавек. Бліжэй да заканчэння рэгістрацыі абітурыенты традыцыйна актывізаваліся. І калі ў першыя майскія дні ў пунктах рэгістрацыі назіралася зацішша, то цяпер штодня пропускі на ЦТ афармляюць у сярэднім ад 4 да 5 тысяч чалавек. У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў мяркуюць, што колькасць абітурыентаў, якія паўдзельнічаюць у гэтым годзе ў ЦТ, будзе каля 100 тысяч чалавек.

Самая вялікая колькасць абітурыентаў — больш як 58 тысяч — зарэгістравалася для здачы тэста па рускай мове. А на тэсціраванне па беларускай мове афармілі пропускі каля 19 тысяч чалавек. Дарэчы, гісторыю Беларусі на беларускай мове сёлета пажадалі здаваць усяго каля 11% ад агульнай колькасці зарэгістраваных. На іншых дысцыплінах колькасць беларускамоўных абітурыентаў вагаецца ў межах 5—7%, а грамадазнаўства на роднай мове будуць пісаць толькі 1,5% удзельнікаў тэсціравання па гэтым прадмеце. Як бачым, з кожным годам тых, хто робіць на цэнтралізаваным тэсціраванні свой выбар на карысць роднай мовы, становіцца ўсё менш.

У апошнюю майскую суботу пункты рэгістрацыі працуюць да 18 гадзін. А 1 чэрвеня абітурыентаў будуць чакаць да 19 гадзін. Да гэтага тэрміну ў абітурыентаў ёсць права змяніць кола экзаменацыйных дысцыплін, калі пропускі на цэнтралізаванае тэсціраванне яны паспелі аформіць раней. Для гэтага ім трэба звярнуцца ў пункт рэгістрацыі з пропускам па тым прадмеце, які трэба замяніць, і квітанцыяй аб аплаце.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Вольга КУПЦОВА планує атрымаць другую вышэйшую адукацыю, таму зазірнула ў Белдзяржуніверсітэт, каб зарэгістравацца на цэнтралізаванае тэсціраванне.**

■ Цёплы дом

# ЖЫЛЛЁ... З САЛАМЯНЫХ «КУБІКАЎ»

**У Беларусі створана першая інавацыйная тэхналогія для будаўніцтва дамоў з прыродных матэрыялаў. «Бацькі» распрацоўкі — віякаканструктар Уладзімір КРУПСКІ і цеплафізік Андрэй ХАЎРАТОВІЧ — прапанавалі ўласную сістэму для зборкі сцен, перакрыццяў і даху з саламяных блокаў «Экакуб».**

З выгляду будаўнічы блок нагадвае звычайны «кубік» з саломы. Гэты элемент складаецца з пластыкавага супрацькратовага каркаса, уцяпляльніка і паверхні. У якасці ўцяпляльніка ідзе ўтрамбаваная салома. Уладзімір пераконвае: матэрыял прыдатны для ўцяплення: ён у сем разоў больш устойлівы за дрэва, больш моцны, а гніе менш. Драўніна ў канструкцыі таксама выкарыстоўваецца — з яе зроблены сілавы каркас паверхні «экакубіка».

СТАР. 4



**«Прамая лінія»**

## ЭНЕРГАЭФЕКТЫЎНАСЦЬ У ПОБЫЦЕ

Бадай, кожны з нас марыць пра цёплы і ўтульны дом. Яшчэ лепей, калі ён не патрабуе вялікіх выдаткаў на ўтрыманне. Дасягнуць гэтага можна дзякуючы энергазберажэнню. Галоўнае — рабіць усё з розумам. Ці насамрэч энергазберагальныя лямпачкі даюць значную эканомію электрычнасці? Класы энергаэфектыўнасці бытавой тэхнікі — рэкламны ход ці рэальная выгада? Як не аплачваць залішняе ацяпленне? На гэтыя і іншыя пытанні **3 чэрвеня з 11.00 да 12.00** падчас «прамой лініі» ў рэдакцыі газеты «Звязда» адкажа **намеснік старшыні Дзяржстандарта — дырэктар дэпартамента па энергаэфектыўнасці Сяргей Аляксандравіч СЯМАШКА.**

Задаваць пытанні падчас «прамой лініі» можна будзе па тэлефоне: **8 (017) 287 18 71**. Папярэднія пытанні дасылайце на электронны адрас рэдакцыі (**info@zvyazda.minsk.by**) або задавайце па тэлефонах:
**8 (017) 292 38 02**
ці **8 (017) 287 17 51**.


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2015 года!**

**Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.**

**Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.**

■ Блізкая ўлада

# ЗАЙЗДРАСЦЬ НЕ НАЙЛЕПШЫ ДАРАДЧЫК

## Старшыня Мінаблвыканкама параіў суседзям сесці за стол перамоў

**Прыватызацыя і рамонт жылля, рэалізацыя інвестыцыйных дагавораў, укараненне экалагічных метадаў вырошчвання прадукцыі, газіфікацыя аграгарадкоў. Гэтыя і іншыя пытанні разгледзеў <u>старшыня Мінскага аблвыканкама Сямён ШАПІРА</u> падчас выязнога прыёму грамадзян у Мядзелі. Частка зваротаў была вырашана на месцы. Некаторыя з іх патрабуюць дадатковага вывучэння. Адказ заяўнікам будзе дадзены пазней.**

Як заўсёды, не абышлося і без суседскіх спрэчак. Муж і жонка з вёскі Баяры звярнуліся з просьбай пасадзейнічаць у зносе гаспадарчых пабудоў суседзяў, якія ўзведзены самавольна. Пражываюць яны ў доме, які належаў раней вайсковай часці. Адпаведна і зямля знаходзілася ў яе ўласнасці, а цяпер аказалася «нічыйнай». Паколькі ўчастак не аформлены па законе, мясцовыя ўлады не змаглі дапамагчы ў вырашэнні канфліктнай сітуацыі. Сямён Шапіра параіў сужэнцам звярнуцца з гэтым пытаннем у суд. Апошняе вед заяўнікаў суправаджаўся слайдамі з тымі злашчаснымі пабудовамі. Уважліва прагледзеўшы «карцінкі», кіраўнік сталічнага рэгіёна заўважыў, што яны даволі прыстойныя, моцныя, не псуюць агульны выгляд. «Навошта разбураць тое, што людзі пабудавалі сваімі рукамі. Тым больш, што ўсё зроблена акуратна, тэрыторыя вакол добраўпарадкавана», — канстатаваў Сямён Барысавіч.

Бясспрэчна, вырашыць канфлікт паміж суседзямі, які цягнецца не адзін год, вельмі цяжка, а, можа, нават і немагчыма. Перш за ўсё яны самі павінны пайсці адзін аднаму насустрач, на ўступкі. Сямён Шапіра параіў сем'ям сесці за стол перамоў: злосць, зайздрасць не найлепшыя дарадчыкі.

Ірына Бурцава звярнулася па дапамогу з пытаннем па ўстанаўленні права ўласнасці на два дамы і зямельны ўчастак для іх абслугоўвання. Мясцовыя ўлады спрабавалі дапамагчы жанчыне, але... Паводле заканадаўства, на адным участку не могуць быць зарэгістраваны два дамы. Кіраўнік цэнтральнага рэгіёна запрасіў прадстаўнікоў юрыдычнай, землеўпарадкавальнай службаў, раённага ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і даў даручэнне падумаць, як лепш на законных падставах дапамагчы заяўніцы, а да канца прыёму далажыць яму пра вынікі. І варыянт знайшоўся: да зямельнага ўчастка будзе нарэзана яшчэ некалькі сотак зямлі. І тады гаспадыня можа зарэгістраваць дом і надзел.


Фота Надзеі БУЖАН.

А вось адна з кампаній, па словах яе кіраўнікоў, плануе пабудаваць у курортным пасёлку Нарач турыстычны комплекс паляўнічага і рыбалова. Інвестыцыйны дагавор прадоўжаны да 1 верасня, але да гэтага часу няма адводу зямлі і дазволу на будаўніцтва. Як адзначылі прадстаўнікі фірмы, яно павінна было пачацца 1 мая, аднак прэтэнзіі да праекта ўзніклі ў Камітэта дзяржбяспекі. А калі аб'ект не будзе ўзведзены ў тэрмін, то давядзецца заплаціць штраф. Заяўнікі прасілі Сямёна Шапіру пахадатайнічаць працягнуць тэрмін дагавора.

Кіраўнік цэнтральнага рэгіёна параіў ім звярнуцца ў спецыяльную камісію Мінаблвыканкама, якая высветліць, па чыёй віне зацягнуліся тэрміны рэалізацыі інвестыцыйнага праекта. Калі вінаваты абласныя службы, то ён будзе працягнуты без штрафных санкцый. Між іншым, старшыня аблвыканкама звярнуў увагу на тое, што некаторыя суб'екты гаспадарання свядома заніжаюць кошт праекта: пры несвоечасовай здачы сума штрафаў будзе меншай. Як адзначыў Сямён Шапіра, адразу бачна, што праект у 2 млрд рублёў, які прапанавала кампанія, у дзясяткі разоў даражэйшы. Акрамя таго, ён заўважыў, што ўчастак для будаўніцтва ў 1,5 гектара надта вялікі. Аб'ект такога тыпу можна ўзвесці на значна меншай тэрыторыі. Заадно кіраўнік цэнтральнага рэгіёна папярэдзіў, што комплекс павінен выкарыстоўвацца па прызначэнні. Здараецца і так, што пад выглядам турыстычных аб'ектаў некаторыя дзялкі спрабуюць пабудаваць на беразе возера домік для асабістага пражывання. «Такога ў Мінскай вобласці не будзе», — адназначна сказаў Сямён Шапіра.

Што тычыцца газіфікацыі аграгарадкоў, добраўпарадкавання населеных пунктаў, то Мядзельскім райвыканкамам распрацаваны графікі з указаннем часу правядзення работ, якія надрукаваны ў мясцовай газеце.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■

# Да Беларусі — з любоўю

## Чым прыцягальная наша краіна для навукоўцаў свету?

**Палюбіць Беларусь проста — трэба яе лепш ведаць. У гэтыя дні гэта дакажуць навукоўцы з розных краін свету, якія займаюцца вельмі ўдзячнай справай: даследуюць беларускую культуру ў самых розных навуковых напрамках. Даследаваць ёсць што — дзякуй Богу і ўсім нашым продкам, папярэднікам і сучасным стваральнікам беларускай культуры. 27 мая ў будынку Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адбудзецца ўрачыстае адкрыццё VI Міжнароднага кангрэса беларусістаў, буйнога міжнароднага навуковага форуму па пытаннях беларусазнаўства.**

Калі мы ў кімсьці ці чымсьці зацікаўлены, то звычайна імкнёмся лепш зразумець: чаму гэта так, а не інакш, у чым прычыны і што асаблівага, унікальнага ў з'яве, чалавеку ці наогул у краіне. Людзі, якія вельмі шчыра любяць Беларусь, — беларусісты. Навукоўцы, даследчыкі, руплўцы, апантаныя людзі, што імкнуцца зразумець вытокі беларускай культуры і патлумачыць сучасныя працэсы. Уявіце сабе: толькі адна краіна і яе культура ва ўсіх праявах — а колькі напрамкаў для навуковай працы! Гісторыя і культуралогія, этналогія і фалькларыстыка, мовазнаўства і літаратуразнаўства, адносіны з іншымі народамі і іх уплыў на развіццё сучаснай беларускай культуры. Колькі глебы для адкрыццяў і сенсацый (за 1000-гадовую гісторыю назапасіліся багатыя пласты, у якіх схавана яшчэ шмат таямніц).

Міжнародны кангрэс беларусістаў ладзіць «Міжнародная асацыяцыя беларусістаў», якую ўзначальвае Міхаіл Касцюк, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, доктар гістарычных навук, прафесар. Але ўсё пачыналася з вельмі апантанага руплўца прафесара Адама Мальдзіса, які з'яўляецца ганаровым старшынёй гэтай грамадскай арганізацыі, што, акрамя навуковых задач, мае і больш высокія мэты: спрыяць пашырэнню і папулярызацыі ведаў пра Беларусь, садзейнічаць узаемадзеянню беларускага народа з іншымі народамі свету. Але не менш важна адкрываць Беларусь і яе жыхарам. І ўжо не навіна, што шмат гадоў гэтым займаюцца навукоўцы як з Беларусі, так і з ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, Японіі, Польшчы, Расіі і іншых краін.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцкий пивоваренный завод» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом имущества:**

**здание административного корпуса, общ. пл. 2168.9 кв.м (инв. № 640/С-27293); весовая, общ. пл. 25.8 кв.м (инв. № 640/С-27303); переходная галерея, общ. пл. 65 кв.м (инв. № 640/С-27304); элеватор, общ. пл. 1414.3 кв.м (инв. № 640/С-27309); главный производственный корпус, общ. пл. 12370 кв.м (инв. № 640/С-27312); проходная, общ. пл. 30.8 кв.м (инв. № 640/С-27313); незавершенное законсервированное капитальное строение, общ. пл. 440.2 кв.м (инв. № 640/U-72996); оборудование элеватора** на земельном участке площадью **3.1450 га** по адресу: **г. Слуцк, ул. Тутаринова, 1;**

**трансформаторная подстанция, общ. пл. 40,2 кв.м (инв. № 640/С-27297); насосная станция (станция 2 подъема), общ. пл. 116.9 кв.м (инв. № 640/С-51797)**. на земельном участке площадью **0,1960 га** по адресу: **г. Слуцк, ул. Головащенко;**

**скважина № 8** (инв. № 640/С-27298) и **ограждение**.

**Начальная цена с НДС – 12 677 609 840 бел. руб. *<u>(стоимость снижена на 30%)</u>*. Задаток 5% от начальной цены (633 880 492 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

*Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 08.05.2015.*

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **09.06.2015 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.06.2015 до 16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**


■ Выбары—2015

# Моладзь, інтэрнэт і жанчына-кандыдат

**Старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына падтрымала ідэю стварэння клубаў маладых выбаршчыкаў у кожным раёне Мінска, якая была выказана на пасяджэнні Маладзёжнай палаты пры Мінскім гарадскім Савеце дэпутатаў. «Гэта вельмі добрая ініцыятыва. Я заўсёды прыводжу такі прыклад: будучая «жалезная лэдзі» Маргарэт Тэтчар пачынала сваю палітычную кар'еру з таго, што дапамагала на выбарах свайму бацьку — кіраўніку пярвічнай арганізацыі Партыі кансерватараў», — сказала Лідзія Ярмошына.**

У Мінску такі клуб быў створаны на базе гімназіі № 31. Адна з яго задач — павышэнне ўзроўню прававой дасведчанасці насельніцтва, фарміраванне больш адказнага стаўлення да выканання грамадзянскага абавязку.

Старшыня Цэнтрвыбаркама дадала, што пры стварэнні такіх клубаў можна ўлічваць расійскі вопыт і праводзіць розныя дыскусіі. Аднак, на яе думку, справа не павінна абмяжоўвацца толькі гэтым, удзельнікі клубаў могуць дапамагаць участковым выбарчым камісіям. Калі ж гэта яшчэ непаўналетнія, то ім можна даручаць запаўненне запрашэнняў для выбаршчыкаў.

Лідзія Ярмошына таксама нагадала, што ў гэтым годзе Цэнтрвыбаркам плануе ўвесці дадатковыя магчымасці для сляпых выбаршчыкаў і выбаршчыкаў са слабым зрокам. Удзельнікі клубаў маглі б дапамагчы і ў гэтым, напрыклад, ім можна даручыць суправаджаць такіх выбаршчыкаў да ўчастка. Акрамя таго, члены клубаў маладых выбаршчыкаў могуць прыходзіць на сустрэчы з кандыдатамі і задаваць свае пытанні.

Кіраўнік ЦВК выказала надзею, што клубы дапамогуць вырашыць такую агульнаеўрапейскую хваробу, як адносна невысокая актыўнасць моладзі на выбарах.

Адказваючы на пытанне пра тое, колькі маладых людзей (да 30 гадоў), паводле яе прагнозаў, могуць увайсці ў склад выбарчых камісій у ходзе маючай адбыцца выбарчай кампаніі, Лідзія Ярмошына звярнула ўвагу, што ЦВК спецыяльна не займаецца такімі падлікамі. Яна падкрэсліла, што грамадскія арганізацыі маюць права вылучаць у склад камісій сваіх прадстаўнікоў, у тым ліку і моладзь. Аднак гэта не датычыцца клубаў маладых выбаршчыкаў, паколькі іх можна лічыць грамадскімі ініцыятывамі, але не грамадскімі арганізацыямі.

Старшыня Цэнтрвыбаркама таксама паведаміла, што да маючых адбыцца выбараў Прэзідэнта Беларусі сайт ЦВК стане больш зручным для карыстальнікаў. «На гэты момант мы займаемся абнаўленнем дызайну нашага сайта. Ён будзе больш зручным, можна будзе хутчэй знайсці патрэбны матэрыял. Таксама мы працуем над адкрыццём сайта па выбарах прэзідэнта, які будзе дзейнічаць тры месяцы», — сказала Лідзія Ярмошына.

Кіраўнік ЦВК адзначыла, што камісія цяпер займаецца вывучэннем пытанняў, звязаных з выдаткамі на найбліжэйшыя выбары. Вырашаюцца іншыя тэхнічныя моманты. У тым ліку выпрацоўваюцца брашуры, якія будуць выкарыстоўвацца выбарчымі камісіямі.

Накont магчымасці з'яўлення жанчын сярод кандыдатаў у час сёлетняй выбарчай кампаніі Лідзія Ярмошына заўважыла, што гэта будзе сведчыць пра больш высокі ўзровень развіцця нацыі. «Гэта цывілізаванасць нацыі, калі на выбары ідуць тыя, хто раней не меў выбарчага права. Гэта сведчыць аб тым, што нацыя дасягнула вельмі высокага ўзроўню развіцця, у тым ліку і ў гендарным пытанні», — сказала яна.

Лідзія Ярмошына дадала, што з'яўленне ў гэтай выбарчай кампаніі кандыдата-жанчыны цалкам рэальная.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■


Утерянные страховые свидетельства «Обязательное страхование гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь» серии ВА № 0173173-0173174 в количестве 2 (двух) штук в Представительстве Белгосстраха по Червенскому району **считать недействительными.** УНП 600013344

Утерянную печать ООО «ВЭП» (УНП 100192545) **считать недействительной.** ООО «Белкрам и К» УНП 100193618

**ПРИГЛАШАЕМ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПЕРЕГОВОРАХ**

**на выполнение работ (оказание услуг) по гидропневматической промывке трубопроводов системы отопления диаметром до 100 мм в общежитии учреждения образования «Минский государственный колледж технологии и дизайна легкой промышленности», расположенного по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 46.**

С конкурсной документацией можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 26.
Срок предоставления предложений: с 8.30 28.05.2015 до 11.00 04.06.2015, контактные телефоны: 290 81 48, 365 32 96, 365 27 11; тел.факс 365 30 12. УНП 100223411

■ Класныя навіны

## НА БЕЛАРУСКУЮ ФІЛАЛОГІЮ — САМЫЯ ВЫСОКІЯ БАЛЫ

### Агульны конкурс у Ліцэй БДУ склаў у бягучым годзе 7 чалавек на месца

**Усяго ад дзевяцікласнікаў паступіла 1651 заява. У тым ліку свае жаданне навучацца менавіта ў гэтай навучальнай установе выказаў 31 пераможца рэспубліканскіх прадметных алімпіяд, якія залічваюцца без уступных іспытаў. Усяго ў гэтым годзе ў Ліцэй БДУ ў 10-ы клас будзе прынята 264 навучэнцы, з якіх будзе сфарміравана 12 класаў па 22 чалавекі.**

Найбольшая колькасць абітурыентаў пастуапала ў фізіка-матэматычныя класы — 649 чалавек. Конкурс у гэтым годзе склаў 6,3 чалавека на месца.

На паступленне ў хіміка-біялагічныя класы было пададзена 327 заяў, у філалагічныя — 358, грамадазнаўчыя — 166 і хіміка-матэматычныя — 151.

Самы высокі конкурс — 11,3 чалавека (!) на месца быў зафіксаваны на рускім філалагічным напрамку. Прахадныя балы выраслі па ўсіх напрамках. Так, на грамадазнаўчы напрамак трэба было набраць у гэтым годзе 116 балаў, на рускі філалагічны — 123, беларускі філалагічны — 142, хіміка-біялагічны — 125, хіміка-матэматычны — 124 і на фізіка-матэматычны — 115 балаў.

Жыхароў сталіцы сярод будучых ліцэістаў 80%, астатнія — прадстаўнікі ўсіх абласцей Беларусі.

У 2015 годзе ўпершыню ў гісторыі Ліцэя БДУ былі рэкамендаваны да залічэння навучэнцы, якія вывучалі ў базавай школе кітайскую мову. У далейшым выкладанне для іх кітайскай мовы будзе забяспечана і на новым месцы вучобы. Большасць будучых ліцэістаў (250 з 264) вывучалі ў школах англійскую мову, астатнія школьнікі — нямецкую, французскую і іспанскую.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

## АВІЯКАМПАНІЯ AIR LITUANICA СПЫНЯЕ СВАЮ ДЗЕЙНАСЦЬ

**Дырэктар Адміністрацыі грамадзянскай авіяцыі Літвы Ёрыс ГІНЦІЛАС заявіў, што 22 мая, каля апоўдні было прынята рашэнне спыніць дзейнасць ліцэнзіі авіякампаніі Air Lituanica. Яна ў сваёй заяве паведаміла, што «з'явілася рызыка фінансавых цяжкасцей, з прычыны якіх кампанія не здольна выконваць свае абавязацельствы перад пасажырамі, і спыняе палёты на ўсіх маршрутах».**

Камерцыйны дырэктар Air Lituanica Сімонас Барткус патлумачыў, што спыніць дзейнасць кампанію прымусілі відавочныя прыкметы таго, што «цяперашнія акцыянеры Air Lituanica не будуць інвеставаць у кампанію па ўстаноўленым бізнес-плане і няма надзеі на хуткі прыход новых інвестараў».

Пасажыраў, якія купілі білеты на рэйсы гэтай кампаніі, супакойваюць, што частка кліентаў будзе перададзена кампаніі Air Baltic, пра астатніх пакуль вядуцца перамовы.

Па даных Вільнюскага аэрапорта, апошні самалёт Air Lituanica вылецеў 22 мая ў 11:25 у Парыж. У той жа дзень авіякампанія Air Lituanica павінна была ажыццявіць рэйсы ў Берлін, Прагу і Стакгольм, але яны былі адазваны. Таксама адазваны рэйсы, запланаваныя на наступныя дні.

Цяпер Air Lituanica вядзе не простыя перамовы з іншымі авіякампаніямі аб пасажырах, якія павінны вылецець у найбліжэйшыя 14 дзён. Незразумела, хто пакрые нанесеную шкоду. А кліентаў, якія набылі білеты на рэйсы праз месяц і больш тэрмін, нямала. У прэсу прасачыліся звесткі, што авіякампанія прадала 25 тысяч білетаў на рэйсы пасля 22 мая.

**Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС,**
**уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве,** *г. Вільнюс.*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## СПАРТСМЕНАМ У ІНТЭРНЭТ-КРАМЫ НЕ ЗВЯРТАЦЦА

**Міністэрства гандлю правяло праверку шэрагу інтэрнэт-крамаў, якія прапаноўвалі спецыялізаваную прадукцыю для харчавання спартсменаў.**

Па выніках суб'ектам гаспадарання вынесена 21 прадпісанне аб ліквідацыі парушэнняў правоў спажыўца і правіл гандлю. Вядзецца работа па прыцягненні парушальнікаў да адміністрацыйнай адказнасці.

У Міністэрстве гандлю нагадалі, што Правіламі продажу тавараў пры вядзенні рознічнага гандлю, якія зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15 студзеня 2009 года №31, не дапускаецца продаж па ўзорах без (па-за) гандлёвага аб'екта спецыялізаванай харчовай прадукцыі для харчавання спартсменаў. Гэтая норма ўведзена для абароны спажыўцоў у частцы забеспячэння якасці і бяспекі прадукцыі, якая рэалізуецца. Парушэнне заканадаўства вядзе да адміністрацыйнай адказнасці.

## ТЭЛЕФОН ДАВЕРУ НЕ МАЎЧЫЦЬ

**Штомесяц дзяжурная служба Дзяржінспекцыі прымае каля 200 званкоў. Пераважна па тэлефоне даверу звяртаюцца відавочцы парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства — неабыякавыя рыбакі ці простыя грамадзяне.**

Адно з апошніх паведамленняў было з Ашмянскага раёна: на вадаёме каля вёскі Лейлубка рыбу лавілі сеткамі. Парушальніка ў гідракасцюме работнікі Смаргонскай міжрайінспекцыі затрымалі, калі той выцягваў забароненую прыладу лоўлі на бераг. Мужчына быў з суседняй вёскі. Злавіць ён паспеў няшмат, усяго 2,5 кілаграма рыбы, тым не менш шкода ад яго дзеянняў ацэнена амаль у 5 мільёнаў рублёў, не лічачы штрафу.

Па «гарачых слядах» — праз паўгадзіны пасля паведамлення пра парушэнне — затрымалі інспектары Гомельскай міжрайінспекцыі і двух браканьераў, што выкарыстоўвалі невад на затоне Дняпра каля вёскі Красны Мост у Рэчыцкім раёне. Дзякуючы званку ад відавочцаў атрымалася затрымаць дачніка, які арудаваў «павуком» у Пухавіцкім раёне на месцы зліцця Талькі і Свіслачы. А на вадаёме каля вёскі Дабрынёва пад Дзяржынскам — разагнаць п'яную кампанію, што чакала юшкі для працягу «банкету».

## ПАДТРЫМАЕМ ПАЦЯРПЕЛЫХ СІБІРАКОЎ

**Беларусь акажа гуманітарную дапамогу Рэспубліцы Хакасія і Забайкальскаму краю. Гэта будзе зроблена па рашэнні кіраўніка дзяржавы.**

Паводле інфармацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, атрыманай ад расійскіх калег, у 55 населеных пунктах на поўдні Сібіры ад агню пацярпелі 1 469 прыватных жылых дамоў, больш за палову з якіх — у Рэспубліцы Хакасія. У васьмі пунктах часовага размяшчэння знаходзяцца 528 чалавек, у тым ліку 114 дзяцей.

Пасольства нашай краіны ў Маскве правяло перамовы з кіраўнікамі ўпраўлення па грамадзянскай абароне, надзвычайных сітуацыях і пажарнай бяспецы пацярпелых рэгіёнаў. Па звестках службаў выратавання, пацярпелым у Забайкаллі патрабуюцца кансерваваныя прадукты харчавання, сродкі асабістай гігіены, ніжняя бялізна, дзіцячае адзенне і харчаванне, падгузкі, медыкаменты, абутак, посуд. Таксама ёсць патрэба ў бытавой тэхніцы, мэблі.

Згодна з пастановай урада, Беларусь накіруе ў пацярпелыя рэгіёны медыкаменты, кансерваваныя прадукты харчавання, дзіцячыя кансервы, сухія малочныя сумесі, мыла, прадметы асабістай гігіены, ручнікі, дзіцячае адзенне, мужчынскі, жаночы і дзіцячы абутак, мікрахвалевыя печы, ложкі і тумбы. Усяго ў пацярпелыя рэгіёны наша краіна накіруе гуманітарнага грузу на суму каля 2,25 мільярда рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Імпрэза

# Квіткі на канцэрт-адкрыццё ўжо раскуплены

**І гэта нягледзячы на тое, што да пачатку дзеі застаецца яшчэ паўтара тыдня — XV Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі пройдзе ў Маладзечне з 5 па 7 чэрвеня.**

Арганізатары адзначаюць, што гэта адзіны фестываль у нашай краіне, які мае статус нацыянальнага, чым і тлумачыцца такая цікавасць да яго. Падчас дзейства можна будзе пачуць найбольш канцэнтраваную праграму твораў айчынных выканаўцаў на роднай мове.

«На тры святочныя дні ў горад з'едзецца ўся эліта нашай краіны, — упэўнена дырэктар Палаца культуры Маладзечна Святлана Сарока, — мяркуючы па тым, адкуль набываюцца квіткі і паступаюць тэлефанаванні з пытаннямі наконт фестывалю».

Адкрыецца свята канцэртнай праграмай «Беларусь незалежная ў вершах і песнях» — будуць прадстаўлены найлепшыя творы, напісаныя ў нашай краіне больш чым за 20 гадоў незалежнасці. Яшчэ адна навінка — тое, што гледачы змогуць убачыць не толькі самых выканаўцаў, але і аўтараў песень, якія звычайна застаюцца за кадрам.

**Першы намеснік міністра культуры Ірына ДРЫГА** адзначае:

— Часта мне задаюць пытанні: «А ці ёсць яна, новая беларуская песня? Наколькі яна папулярная?» Каб разбурыць міф пра беларускую музыку як постсавецкую, мы і падрыхтавалі праграму нашай сучаснай эстрады. Пагадзіцеся, што сённяшняму выканаўцу, кампазітару нашмат цяжэй заваяваць прызнанне аўдыторыі, чым гэта можна было зрабіць у савецкі час. Напрыклад, у Мінск цяпер прыязджаюць сусветныя зоркі — Scorpions, Rammstein, Джэніфер Лопез, якія на сваю раскрутку трацяць вялізныя грошы. Раней глядач змагаўся за квіток, думаючы, як яго дастаць, а цяпер арганізатары канцэртаў змагаюцца за гледача, спрабуючы прывабіць. Таму вельмі важна падтрымаць нацыянальных выканаўцаў, дапамагчы ім сустрэцца з гледачом, слухачом. Трэба прывучыць людзей слухаць, любіць сваё. Бо без беларускай песні, верша, музыкі мы, урэшце, не зможам быць беларусамі. Менавіта такі зварот да нацыянальнай творчасці і ёсць праява сапраўднага патрыятызму.

Асабліва яскравым сёлета, у Год моладзі, абяцае быць і заключны этап конкурсу маладых выканаўцаў. Як адзначыў народны артыст Беларусі, прафесар Міхаіл Фінберг, маладыя людзі будуць спяваць на галоўнай сцэне ў амфітэатры ў суправаджэнні Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі. І з іх вуснаў мы таксама пачуем новыя яскравыя беларускія песні. Час пакажа, ці стануць яны хітамі...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

■



■ Фестывалім!

# ЗАЛАТАЯ ПЧОЛКА ПРЫЛЯЦЕЛА Ў КЛІМАВІЧЫ

### XV Міжнародны фестываль дзіцячай творчасці сабраў прадстаўнікоў 12 краін

**4 фестывальныя дні на розных творчых пляцоўках Клімавіч будуць выступаць юныя выканаўцы і дзіцячыя калектывы з Беларусі, Расіі, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Латвіі, Літвы, Турцыі, Узбекістана, Украіны, Эстоніі.**

— Толькі дзяцей збярэцца на гэтае свята каля тысячы, — паведаміла **намеснік старшыні Клімавіцкага райвыканкама Кацярына МУЗЫЧЭНКА.** — Да нас прыехала дэлегацыя з Турцыі, на жаль, не будзе сярод гасцей прадстаўнікоў Ізраіля і Фінляндыі, якія спасаліся на фінансавыя праблемы. Але, напрыклад, Узбекістан, які будзе гасцяваць у нас другі раз, прывозіць шмат калектываў. Галоўная мэта фестывалю — даць магчымасць дзецям розных краін пазнаёміцца і стаць сябрамі.

На юбілейны форум запрошаны зоркі беларускай эстрады Алена Ланская, Іван Буслай і іншыя. У склад журы фестывалю ўвойдуць вядомая армянская балерына Жаклін Сархашан, мастацкі кіраўнік нацыянальнага акадэмічнага народнага хору імя Цітовіча Міхаіл Дрынеўскі, майстэрства танцавальных калектываў ацэніць Расэн Багданаў, старшыня федэрацыі фальклорных груп Балгарыі, краіны, з якой Клімавічы ў рамках фестывалю падпішуць пагадненне ў сферы культуры і мастацтва.

На плошчы Вялікага Кастрычніка — галоўнай «арэне» мерапрыемства — моладзь арганізуе шмат цікавых праграм, будзе працаваць тэматычная пляцоўка, прысвечаная 70-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Завершыцца свята вялікім шэсцем «На крылах натхнення», цырымоніяй узнагароджання лаўрэатаў конкурсу і заключным гала-канцэртам «Залатыя фарбы фестывалю».

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■

Сямейная газета

Выпуск № 8 (31)



Фота Надзеі БУЖАН.

## ВУЧЫМСЯ... ПАДАЦЬ

Думаю, у любых бацькоў ёсць у запасе некалькі гісторый з вашага дзяцінства. Мае не выключэнне. Адна з іх пра тое, як тата прывёз з камандзіроўкі ў падарунак арэлі. Іх паставілі ў дзіцячым пакоі і штовечар перад сном гушкалі мяне на іх. Што цікава: калі гушкала маці, то я кідалася ў слёзы і прасіла, каб гэта зрабіў тата, які ўжо ляжаў у ложку. Як толькі сонны тата выконваў маё жаданне — зноў выклікала маму. На гэтым мая гульня ў «хачу не хачу» не заканчвалася. Давалі цукерку — прасіла печыва, і наадварот. Бацькам нічога не заставалася, як запасацца разнастайнымі ласункамі, каб, калі што, дагадзіць любому майму капрызу. Дзякуй Богу, мама з татам своечасова зразумелі, што ўседазволенасць — гэта зло (і калі так пойдзе далей, я магу сесці на шыю). Інакш няпроста б мне прыйшлося ў дарослым жыцці...

Сярод маіх знаёмых вельмі шмат маладых мамачак. З цікавасцю назіраю, як яны выхоўваюць сваіх сыночкаў і лапачак-дочак. Нехта здзьмухвае пылінкі: варта толькі заплакаць — дзіцяці дастаецца ўсё, што пажадае. Так расце маленькі маніпулятар-дыктатар, які будзе думаць, што яму ўсе вакол нешта павінны. Іншая крайнасць, калі дзіця як быццам нікому не патрэбна: з ім не хочуць чытаць, разглядаць малюнкі, гуляць у салдацікі. Неяк у трамваі назірала за мамай з навушнікамі, якой маленькі сын усю дарогу спрабаваў нешта расказаць. Але той, відавочна, было нецікава, яна незадаволена адмахвалася: «Адчапіся», «Не перашкаджай», «Ну што табе зноў патрэбна?..» Не здзіўлюся, калі праз колькі гадоў тая мама пабяжыць да псіхолага ці, не дай Бог, участкова: «Як жа так, у яго ёсць усё, але ён мяне зусім не слухае». Калі б я была на іх месцы, абавязкова спыталася б: «Дарагая, дзе ты была, калі ён хацеў з табой пагаварыць?» Хадзіла з заткнутымі вушамі...

Многія бацькі лічаць сваім доўгам выключна накарміць ды апрануць дзіця... Забываюцца пры гэтым (ці проста не разумеюць), што ніякая, нават самая дарагая, абноўка не здольная замяніць жывыя зносіны, абдымкі, казку перад сном... Замест таго, каб дапамагчы, разгледзець талент, дадзены кожнаму ад Бога, большасць з іх за штодзённымі клопатамі пускаюць усё на самацёк і не назіраюць за сваімі дочкамі-сыночкамі. Што яшчэ горш, бацькі спрабуюць рэалізаваць свае нерэалізаваныя жаданні праз дзіця. «Так, мая мама ў свой час не змагла паступіць у музычную школу, бо не было магчымасці набыць інструмент. Таму яна, не раздумваючы, і адправіла мяне вучыцца іграць на фартэпіяна. Я пакутавала тры з паловай гады. І ўрэшце кінула «музыкалку», бо гэта было не маё», — прызналася дырэктарка Жодзінскай жаночай гімназіі. Людміла Талмачова, педагог па адукацыі, цвёрда перакanaна, што навязваць сваё жаданне няправільна. У кожнага дзіцяці свой талент, і задача бацькоў яго заўважыць і развіць, а не думаць, як сябе дарэалізаваць.

Ёсць і маці, якія разважаюць прыблізна так: «Я хачу, каб мая дачка паступіла ў гэты інстытут, а не ў той, выйшла замуж за таго, а не за другога. Бо лічу, што гэта добра». Але пры гэтым наўрад ці задумваюцца, ці добра гэта для яе дзіцяці? Вось і атрымліваецца, што ў 30 гадоў тая дачка кажа: «Мама, ты мне ўсё жыццё разбурыла. Я не туды паступіла, не за таго выйшла замуж... І наогул пражыла не сваё жыццё, а тваё, якое ў цябе не атрымалася»...

Я вельмі ўдзячна сваім бацькам, у тым ліку і за тое, што прывілі мне прагу да вучобы, самаразвіцця... Цяпер, напрыклад, вучуся... падаць, спакойна ставіцца да няўдач. Бо так склалася, што і дома, і ў школе мяне вучылі толькі перамагаць. Дакладна ведаю, я такая не адна. Нядаўна ў сацыяльных сетках знаёмая напісала: «Спакойнае стаўленне да няўдач — вельмі карысная штука, якой мне рэальна не хапіла ў дзяцінстве. Лічу, што выхоўваць яго трэба з ранняга дзяцінства. Таму на бясконцыя падзенні свайго маленькага сына я ўжо амаль не рэагую, удакладняю толькі, ці ўсё ў парадку. І трэба сказаць, ёсць некаторыя поспехі. Разразаючы цішыню, Сціпан забягае на кухню з крыкамі: «Мама, усё ДОБРА — я зваліўся з крэсла!»...

**Надзея ДРЫЛА.**

■ З песняй па жыцці

**Сустрэліся з Дзім Дзімычам (менавіта так папрасіў звяртацца да сябе заслужаны дзеяч культуры Беларусі Дзмітрый Ровенскі) у яго другім доме. Тут — у адным з класаў сталічнай гімназіі № 14, дзе ён працуе настаўнікам музыкі больш як 45 гадоў, — сапраўды хатняя атмасфера: стол, засланы льняным абрусам, гліняныя жбаны на драўляных палічках, нават сапраўдная вясковая печка. І хоць у ёй не патрэскваюць бярозавыя паленцы, тым не менш нам з фатографам надзвычай цёпла. Ад непадробнай апантанасці сваёй справай, якой гараць вочы суразмоўцы, ад таго, з якой пяшчотай ён расказвае пра жонку і сотні дзяцей і ўнукаў.**

Фота Надзеі БУЖАН.



# «МАЁ НАТХНЕННЕ ІГРАЕ НА БУБНЕ»

### «КАХАННЕ СУСТРЭЎ СЯРОД СВАІХ ВУЧАНІЦ»

— Такіх шматдзетных татаў, як я, яшчэ пашукаць трэба, — смяецца кіраўнік дзіцячага фальклорнага ансамбля «Дударыкі». — У мяне ж, акрамя траіх кроўных дзяцей, некалькі сотняў «дударыкаў». Яны мне ўсе як родныя. З дзецьмі пачаў працаваць пасля службы ў войску. У піянерскім летніку, дзе я быў старшым важатым, сама Ангела Меркель адпачывала. Яна прыязджала ў Беларусь з групай школьнікаў з Германіі, Якуціі, Чэхаславакіі ў пачатку 70-х гадоў.

Неўзабаве лёс прывёў маладога важатага ў адну з мінскіх школ, дзе ён і сустрэў галоўную жанчыну ў сваім жыцці. Што цікава, навучыў яе іграць на гітары, перш чым павёў пад вянец.

— Ліда — мая вучаніца. Калі я прыйшоў працаваць у тую школу ў 1948 годзе, яна была ў 9 класе. Сёлета сорак чатыры гады, як мы разам. Лідзін брат — выдатны музыка, нават за абедзенным сталом і кладучыся спаць не выпускаў гітары з рук. Мы з ім хутка сышліся ў захапленнях. Можна сказаць, менавіта праз брата я і звярнуў больш пільную ўвагу на яго сястру.

Лідзію Яўгенаўну, якая ў сямейным ансамблі Ровенскіх спявае і грае на бубне, Дзім Дзімыч з цеплынёй называе сваёй ідэйнай натхняльніцай.

— Жонка — ініцыятар многіх ідэй. Я да яе стараюся прыслухоўвацца. Узяць хаця б гісторыю нашых узаемаадносін з гімназіяй №14, дзе мы выкладаем ужо шмат гадоў і дзе з'явіліся на свет «Дударыкі». Пачыналася ўсё з маленькага кабінецiка. Жонка тады натхніла: «Прасі вялікі клас. Для пачатку — клас!» Сёння нам для занятак вылучылі цэлы корпус. Да таго ж Ліда — мой галоўны крытык. Я, акрамя ўсяго, яшчэ і песні пішу. Магу з яе думкай і не пагадзіцца адразу (*усміхаецца*). А пасля ўсё роўна аказваецца, што жонка мела рацыю.

### «СЯБАР — ГЭТА ТОЙ, ХТО ЗАСТАЎСЯ»

Дзіцячы ансамбль «Дударыкі» Дзмітрый Ровенскі стварыў у 1970 годзе.

— Кожны «дударык» як мінімум з 7 класа грае на 5 інструментах: на гармоніку, дудцы, дудзе, жалейцы, скрыпцы, цымбалах, — з гонарам распавядае Дзім Дзімыч. — Больш за 30 нашых выпускнікоў сталі прафесійнымі музыкамі. Ну што, жэўжыкі (*звяртаецца да дзетак, якія якраз прыйшлі на занятак*), пакажам, на што мы здатныя?

І, як па ўзмаху чароўнай палачкі, праз некалькі хвілін замест будзённай школьнай формы на «дударыках» з'яўляюцца нацыянальныя строі, а ў руках — музычныя інструменты. Ім на розныя галасы падпяваюць чыжыкі, салаўі, канапляначкі, шчыглы...

— А вось гэта — гібрыд канарэйкі і шчыгла, — знаёміць Дзім Дзімыч. — У адрозненне ад іншых птушак, ён спявае цэлы дзень напралёт. Часта бяром яго з сабой на канцэрты. Людзі дзіву даюцца: «Як гэта Ровенскі так птушку выдрэсіраваў?» (*смяецца*). Тут, у гімназіі, толькі частка маіх галасістых сяброў, астатнія жывуць у кватэры, на балконе. Усяго маю 28 відаў птушак — усе нашы, дзікія, беларускія. Раней часта, у тым ліку і разам з дзеткамі, ездзіў на лоўлю. У прыродзе ў птушкі жыццё кароткае. У мяне ж яны жывуць і па 10, і па 15 гадоў. Вучу сваіх «дударыкаў» не толькі іграць на музычных інструментах ды адрозніваць галасы розных птушак, але і розным жыццёвым прамудрасцям... Вось вы, напрыклад, ведаеце, як можна зварыць яйка ў вогнішчы? А мяне ў свой час бабуля навучыла. Як цяпер памятаю, адпраўляе пасвіць коней, збірае есці з сабою і прыгаворвае: «Загарні, унучок, яйка ў анучку, змочаную ў вадзе, ды пакладзі ў вогнішча. Пяць хвілін — і гатова». Ведаеш, «дударыкі» — не проста мае вучні, гэта другая сям'я.

**(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)**

■ У вас будзе дзіця

«ЗВЯЗДА» + АНТ

## Двое ў чаканні шанцу

У кожнага мусіць быць свой дом. У гэтым упэўнена Людміла Бусько — вядучая тэлевізійнай рубрыкі «У вас будзе дзіця», што ўжо больш як тры гады выходзіць на тэлеканале АНТ у межах праграмы «Пакуль усе дома». Аўтары гэтага беларуска-расійскага праекта робяць няпростую справу — шукаюць сем'і дзецям, якія па розных прычынах засталіся без бацькоўскай апекі і выхоўваюцца ў інтэрнатных установах. Для 58 дзяцей ужо знайшоўся новы дом, але да поўнага «раскватаравання» дзіцячых дамоў яшчэ так далёка... «Звязда», якая таксама бярэ ўдзел у праекце, працягвае знаёміць патэнцыйных бацькоў і апекуноў з дзецьмі, якім больш за ўсё патрэбны клопат, увага і любоў.

Дзяўчынцы Тамары — 7 гадоў, яе малодшаму брату Даніку толькі споўнілася 4. Яны жывуць у Ваўкавыскім дзіцячым доме і ведаюць самае галоўнае: што бліжэй за



родных людзей нікога не бывае, таму малыя клапоцяцца і падтрымліваюць адно аднаго. «Тамара — вельмі добрасумленная, уважлівая, акуратная і паслухмяная, — пералічвае выхавальніца Ірына Калыска, — а разам з тым жвавая, непаседлівая, любіць рухомыя, а таксама сюжэтна-ролевыя гульні. Данік — адкрыты і пяшчотны, для свайго ўзросту ўжо самастойны, шмат што робіць сам. Сястрычка і брат вельмі прывязаныя адно да аднаго, а калі гуляюць разам — прыемна глядзець!». І ўсё ж, відавочна, дадаюць педагогі, што для сапраўднага шчасця малым не хапае бацькоўскай любові і клопату — яны вельмі чакаюць і спадзяюцца знайсці «толькі сваіх» маму і тату...

Калі вы хочаце даведацца пра Тамару і Данілу больш, звяжыцеся са спецыялістамі Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі па нумары: (017) 284-71-51. Для тых, хто хоча ўсынавіць дзіця, на сайце videopassport.ru змешчаны відэаанкеты, падрыхтаваныя сумесна НЦУ і творчай групай праекта.

# ПАДАРОЖЖА НА «ПЯЦЬ»

**Мінулым летам Міхаіл Чарапеннікаў разам са сваёй дружнай сям'ёй адправіўся «заваёўваць» абшары паўднёва- і заходнееўрапейскіх краін. Харватыя, Венгрыя, Італія, Аўстрыя, Германія — за акном змяняліся краявіды і месцы, а калекцыя ўражанняў таты, мамы і траіх дзяцей папаўнялася з кожным чарговым прыпынкам. Як арганізаваць выдатнае падарожжа на аўто і... адчуць еднасць вялікай сям'і, раскажа смелы і прадпрымальны тата.**

## ЛЮБІЦЬ (І) ШМАТ ПАДАРОЖНІЧАЦЬ

— Мы любім вандраваць. Я згодны з Маркам Твенам, які казаў: «Толькі пра дзве рэчы вы будзеце шкадаваць — што мала любілі і мала падарожнічалі». Першая паездка адбылася, калі ў нашай сям'і было двое дзяцей — шасці і чатырох гадоў. Нямецкае ўзбярэжжа Балтыйскага мора, Данія, шмат забаў: аквапарк, парам, заапарк, сафары. Мы заўжды стараемся насыціць нашы дні, а не проста бавіць час на пляжы. Напрыканцы адпачынку вырашылі з'ездзіць у Капенгаген — надзвычай прыгожы горад.

Пасля ў нас здарылася трохгадовая паўза, падчас якой мы будавалі кватэру, а потым рабілі рамонт. Усе сродкі ішлі на гэта. Падарожжы адклалі да лепшых часоў. Тым не менш, двойчы ў нас атрымалася вырвацца з паўсядзённасці і з'ехаць. Праўда, без мамы, якая ў гэты час працавала. Адзін раз мы каталіся ў Крым. Я — адзіны вадзіцель, таму было даволі цяжка. Пераезды ў паўтары тысячы кіламетраў стамлялі і мяне, і дзяцей. Увесь час на хаду. Ды яшчэ вечарам усім пачысціць зубы, разуць-раздзець, а раніцай сабраць зноў. Гэта нават складаней, чым ехаць за рулём. Агулам накаталі 4 тысячы кіламетраў. Другі раз я з дзецьмі ездзіў на польска-нямецкую Балтыку.

## УВЕСЬ СВЕТ ПЕРАД ВАЧЫМА

Гэтым разам, калі рамонт фармальна скончыўся, мы вырашылі: едзем падарожнічаць усёй сям'ёй. Спакойна, з асалодай і без паўтаратысячных прабегаў. Дарэчы, чаму выбралі аўтамабіль у якасці сродку перамяшчэння, зразумела. Кошт пяці квіткоў на самалёт істотна б'е па кармане. На аўто атрымліваецца нашмат танней, цікавей і мабільней. Галоўнае — ідэя кароткіх пераездаў. Дзеці таксама сказалі: «Мы не хочам больш ехаць так доўга». Ім быццам бы можна спаць у дарозе, аднак сядзець у бустары ўвесь час прышпіленымі не так лёгка. Асабліва дачцэ. Старэйшаму сыну ўжо лягчэй: ён дасягнуў патрэбных «метр пяцьдзесят» і нават перарос на 20 сантыметраў. Дый самому не хацелася выціскаць з сябе апошнія сілы. Калі пасля доўгай паездкі без перапынкаў прыязджаеш у патрэбнае месца, адчуваеш сябе не вельмі, кажучы мякка.

Далей — яшчэ больш проста. Адкрываем Google Maps і плануем, па якіх пунктах пройдзе маршрут. Важна, каб яны знаходзіліся на невялікай адлегласці і адпавядалі месцам, дзе ёсць на што паглядзець. Пасля пачынаем адаптаваць іх пад свае жаданні. Напрыклад, старэйшы сын не быў у Кракаве (малодшы ўвогуле нідзе не быў). Значыць, адзначаем: Кракаў. Другі прыпынак, без якога немагчыма абысціся, — Будапешт. І, нарэшце, Харватыя. З такіх пунктаў складаўся маршрут у той бок. Вяртаючыся дадому, мы істотна змянілі траекторыю. Паехалі ў Аўстрыю, Мюнхен і Дрэздэн. Усе прабегі каля 400 кіламетраў, дарогі выдатныя і часта бясплатныя. Стомленасці амаль не адчувалася. Суцэльная прыемнасць! І эканомія ў параўнанні з турыстычнымі агенцтвамі — амаль напалову.

Ведома, загадзя мы паклапаціліся пра жыллё (TripAdvisor, hotels.com, booking.com). Мы стараемся арандаваць апартаменты, бо малодшы сын яшчэ маленькі — яму на момант вандроўкі было ўсяго тры з паловай гады. Дый тата апошнія гады харчуецца спецыфічна: часта і маленькімі порцыямі. Турагенцтва не можа дагадзіць усім, бо проста не ведае патрэб кожнага з членаў нашай сям'і.

## «ПРАВІЛА АДНО: НЕ ЛЯНУЙСЯ І ЧЫТАЙ»

Калі рыхтуешся да сямейнага падарожжа, варта звяртаць увагу на дэталі, нюансы, каб не псаваць уражанне дробнымі непрыемнасцямі. Агульная парада — не лянуйся і чытай! У інтэрнэце ўсё напісана. Многія падарожнічаюць, расказваюць пра свае прыгоды, таму варта чытаць, даведвацца пра досвед іншых.

У апісаннях месцаў заўжды адзначаюць, што варта глядзець з дзецьмі, а што не. Можна знайсці мноства зніжак, калі падпісацца на розныя рассылкі. Я нават спецыяльна стварыў асобную паштовую скрыню, куды дасылаюцца прапановы. Ведома, не праглядваю кожную, аднак калі прыходзіць нешта патрэбнае, то карыстаюся. Напрыклад, зусім нядаўна атрымаў зніжку на паркоўку для наступнага падарожжа. Не так шмат, 10 еўра, аднак усё адно прыемна.


**«Выпадкова трапілі ў казку — Альпы».**

Ёсць і абавязковыя правілы, якіх неабходна прытрымлівацца. Першае — мець картку, якой хутка можна расплаціцца ў інтэрнэце. Пажадана асобную, не прывязаную да асноўных рахункаў. Добра заўжды мець наяўныя грошы і лепш — валюту той краіны, куды едзеш. Другое — увага да правілаў і законаў дзяржавы, па якой падарожнічаеш. Еўропа здаецца адкрытай і дэмакратычнай, аднак законы там даволі суровыя. Нікога не будзе цікавіць, што ты толькі што прыехаў і нічога не ведаеш. Лепш загадзя пачытаць, каб валодаць патрэбнай інфармацыяй. Напрыклад, на мяжы са Славеніяй стаіць паліўная запраўка, дзе можна купіць віньетку, гэта значыць аплаціць праезд па дарозе. Гэтую запраўку лёгка праскочыць. Праз некалькі кіламетраў іншая, але перад ёй стаіць паліцэйскі. І ён абавязаны выпісаць штраф памерам 200 еўра: «Прабач, дружа, але няведанне не вызваляе ад грашовага пакарання».

...Мноства ўбачанага застыла на фотаздымках. Так прыемна цяпер праглядваць архівы і ўспамінаць, як добра было. Спадзяёмся, летам будзе не горш. Гэтым разам плануем ляцець самалётам, каб разнастаіць нашы шляхі па Еўропе. І ўсім, хто сапраўды хоча правесці адпачынак «на выдатна», раю: падарожнічайце з сям'ёй.

**Любоў КАСПЯРОВІЧ.**

■ Да тэмы

## У некаторых пасольствах візу можна атрымаць бясплатна

Калі страх і забабоны наконт падарожжаў з дзецьмі засталіся ў мінулым, час паклапаціцца пра атрыманне візы.

Еўропа застаецца найбольш папулярным у беларусаў турыстычным напрамкам, пра што сведчаць 880 тысяч атрыманых шэнгенскіх віз у 2014 годзе. Працэдура афармлення візы для дзяцей складаецца з тых жа крокаў, што і для дарослых.

**Фота павінна быць зроблена не пазней, чым 6 месяцаў таму, твар на ім — займаць 70-80% плошчы, прысутнічаць у кадры іншым асобам не дазволена. Здымак мусіць адлюстроўваць прамы позірк на камеру, выразна паказваць расплюшчаныя вочы. Выраз твару нейтральны, рот закрыты.**




— Як правіла, яны ўключаюць рэгістрацыю анкеты на сайце пасольства і падачу рэгламентаванага пакета дакументаў у прызначаны дзень, — расказвае **валанцёр кампаніі «У Беларусь і Еўропу — без візы» (novisa.by) Вераніка ЮРАНКОВА.** — На дзіця запаўняецца асобная ад бацькоў анкета, у адпаведных палях указваюцца звесткі маці ці бацькі, якая/які падае дакументы. Гэты ж чалавек ставіць подпіс у «дзіцячай» анкеце. Дарэчы, некаторыя консульствы патрабуюць подпісы абаіх бацькоў, таму варта ўдакладніць гэты момант асобна. Пасля трэба прыкласці ксеракопію свайго пашпарта і візы, калі ў бацькоў яна ўжо ёсць.

Таксама напярэдадні візіту ў амбасаду важна не забыць дакумент, які дазваляе выезд дзіцяці за мяжу. Некаторыя візавыя ўстановы патрабуюць яго ўжо на этапе падачы анкеты.

Прысутнасць дзіцяці падчас падачы дакументаў не патрабуецца. Як і аплата за візу, калі малому менш за 6 гадоў. У пасольстве Літвы гэты парог вышэйшы: калі дачка альбо сын не дасягнулі 12-гадовага ўзросту, наклейка ў пашпарце з'явіцца бясплатна.

— Адзначу яшчэ адзін важны момант напярэдадні ўвядзення ў Беларусі біяметрычных віз, што адбудзецца 23 чэрвеня 2015 года. Згодна з артыкулам 13 (7) Візавага кодэкса, дзеці да 12 гадоў вызваляюцца ад абавязку пакідаць адбіткі пальцаў, — дадае валанцёр праекта novisa.by.

# АДПАЧЫНАК З ДЗЕЦЬМІ ЦІ БЕЗ?

**Зарына БАБКО, аўтарка праекта posvetu.by «Падарожжы з дзецьмі на край свету», мама дзвюх дачок — шасці і чатырох гадоў:**

## «МАЛЕЧЫ ВАЖНА ЎСВЕДАМЛЯЦЬ, ШТО ЯНА ПАТРЭБНА СВАІМ БАЦЬКАМ»

Год таму я адкрыла для сябе канадскага псіхолага Гордана Ньюфелда, які строіць тэорыю выхавання на тэорыі прыхільнасці. Яе сутнасць у тым, што да свайго псіхалагічнага сталення дзіця як мага даўжэй павінна заставацца ў кантакце з бацькамі, тады яно мае больш шанцаў вырасці здаровым, гарманічным, шчаслівым, здольным да выражэння жыццёвых цяжкасцяў.

Любое падарожжа патрабуе часу, і калі адрываць малое на працяглы час ад мамы ці таты, дзіця можа адчуваць страх, што яго пакінулі. Нават калі «іншай мамай» стане бабуля альбо блізкі сваяк... Ніякі стрэс, асабліва дзіцячы, не праходзіць бясследна, і пацверджанне гэтаму мы вельмі часта знаходзім праз некалькі гадоў.

Часам я бачу іншы бок медаля: бацькі ўяўляюць, што менавіта ў падарожжы ўсё павінна змяніцца, дзіця раптам стане спакойным і паслухмяным. Не, нічога не зменіцца, яно будзе паводзіць сябе гэтаксама, як паводзіла дома, а можа, і больш неспакойна, бо дарога, іншае атачэнне — гэта стрэс для яго да той пары, пакуль яно не прывыкне да іншай краіны. І бацькі хвалююцца, расчароўваюцца, нервуюцца, не адпачываюць. У гэтым выпадку спярша трэба папрацаваць над сваім успрыманнем маленькага члена сям'і, а пасля думаць, куды можна адправіцца з ім.

Яшчэ некалькі «за» на карысць сямейнага падарожжа:

• Нават самыя маленькія дзеці здольныя да пазнання, а натуральнае развіццё ў новым асяроддзі вельмі эфектыўнае.

• Дзеці, якія шмат вандруюць, не баяцца навакольнага свету. Яны камунікатыўныя, адкрытыя і не адчуваюць перашкод у зносінах з іншамоўнымі людзьмі.

• Падарожжа дорыць моманты яднання сям'і: мы так часта бываем заклапочанымі і занятымі, а падарожжа — выдатная нагода прысвяціць больш часу нашым дзецям.

• Калі ўзяць дзяцей з сабой, то ў галаве не будуць лунаць думкі пра «чым жа займаюцца малыя ў бабулі» ці «як шкада, што яны не змогуць паплаваць у моры».

• Сумеснае падарожжа — добрая магчымасць паназіраць за выхаваннем дзяцей у іншых краінах і культурах, а блізкасць малога выдатна стымулюе ў гэтым кірунку.

• Працяглыя марскія вандроўкі ўмацоўваюць імунітэт і здароўе ўвогуле.




**Аляксей ШУСТАЎ, тата чатырохгадовай Соф'і і гадавалага Аляксандра:**

## «ПАДАРОЖНІЧАЦЬ АДНЫМ ЭГАІСТЫЧНА, АЛЕ НЕАБХОДНА»

Дзеці, асабліва маленькія, часта хварэюць. Пакуль арганізм не падчэпіць усе магчымыя інфекцыі і вірусы, а імунная сістэма не «пакаштуе» іх, рухацца кудысьці далёка не варта. Так сталася падчас нашай першай вандроўкі на поўнач Іспаніі. У адпачынак мы паехалі разам з дачкой. На той момант ёй споўнілася два гады. Згодна з законам Мёрфі, Соф'я захварэла — на ларынгіт. Знаходзячыся дома, ведаеш, якому ўрачу тэлефанаваць, па якія лекі ісці ў аптэку. У чужой краіне гэта было мінімум удвая складаней. Мы быццам бы падрыхтаваліся: узялі з сабой самыя неабходныя прэпараты, тэрмометр. Аднак інгалятар у чамадан не спакавалі, пра што пасля вельмі шкадавалі. Соф'я пачала літаральна задыхацца. Жонка разгубілася, а я адчуваў сябе бездапаможным. Выратавала адміністрацыя гатэля, якая цягам дзвюх гадзін адшукала для нас інгалятар. Вось так: хацелі падмацаваць імунітэт дачкі цёплым кліматам і марскім паветрам, а атрымалася пакута і для яе, і для нас.

Ведома, не ўсе дзеці хварэюць падчас падарожжаў. Але, калі ўлічыць нечаканы стрэс, які яны перажываюць, адаптуючыся да новай краіны, рызыка падчапіць інфекцыю ўзрастае. Пасля мне было сорамна перад дачкой, якая атрымала замест паўднёвага цяпла высокую тэмпературу і хворае горла.

Яшчэ адзін плюс падарожжаў без дзяцей — магчымасць пабыць сам-насам з сабой і жонкай. Пакуль што адчуваю, што маё жыццё мне не належыць. Увесь час, за выключэннем працоўнага, я знаходжуся з дзецьмі. Існуюць толькі іх патрэбы і жаданні. Я не адмаўляюся ад гэтага, аднак калі губляеш кантроль над уласным «эга», становіцца вельмі некамфортна.

Падарожнічаць без дзяцей эгаістычна, але неабходна. Бо інакш губляецца ўласная індывідуальнасць, галоўным у адносінах з жонкай становіцца клопат пра нашых дзяцей. Такім чынам, ёсць шанц знайсці страчаную раўнавагу і гармонію, а пасля зноў вярнуцца да звыклага жыцця і паглядзець на яго іншым, свежым позіркам.

■ З размахам?

# ДАРАГІЯ НАШЫ ВЫПУСКНІКІ

## Выпускны баль адзінаццацікласніка нярэдка становіцца выпрабаваннем для бацькоўскага кашалька

**Застаюцца лічаныя дні да таго часу, калі школьнікі змогуць называць сябе выпускнікамі. Адзвініць апошні званок, праляціць чарада напружаных дзён з экзаменамі, і наступіць дзень выпускнога балю — першага амаль дарослага мерапрыемства ў іх жыцці. Да гэтага дня многія рыхтаваліся ледзь не цэлы год. Так, адна са знаёмых, у якой дачка выпускніца, расказала, што сярэбранае ўпрыгажэнне для дзяўчыны яны купілі ў Маскве за 60 долараў яшчэ ў верасні. І ўжо пад яго падбіралі сукенку — чыста жаночая логіка!**

З сукенкай, можна сказаць, пашанцавала, бо ўдалося купіць стыльную адзежыну ў Польшчы за 150 долараў. Аднакласніцы Кацярыны набывалі вячэрнія строі прыкладна па мільёну рублёў за кожны. Некаторыя, праўда, выбралі для сябе больш дэмакратычны варыянт — купілі кароткія практычныя сукенкі коштам ад 500 да 700 тысяч рублёў, якія можна будзе насіць потым. Туфлі таксама сёння абыходзяцца нятанна, добры абутак каштуе ад 600 000 рублёў. Дзяўчатам яшчэ трэба дабавіць кошт прычоскі, а некаторыя і на макіяж запісваюцца ў салоны. Гэта абыдзецца яшчэ ў некалькі соцень тысяч.

Наталля Міхайлаўна, мама Кацярыны, уваходзіць у бацькоўскі камітэт класа, таму яна добра ведае пра ўсе выпускныя клопаты і іх кошт. Кажа, што хлопца сабраць на вечар у гонар заканчэння школы танней. Але ўсё залежыць ад асабістых густаў і пажаданняў. Некаторыя юнакі з іх класа не набывалі святочных гарнітураў, а выбралі стылёвыя прыталеныя пінжакі, якія і потым можна будзе насіць з джынсамі. Такая рэч каштуе цяпер таксама пад мільён рублёў. Ды ёсць надзея, што не будзе вісець потым выпускны пінжак без справы ў шафе. Штаны для вечара таксама падбіраюцца такія, якія потым можна будзе насіць на занятках ва ўніверсітэт ці каледж. Абутак для юнака ў любым выпадку не прападзе, хлопцы набываюць туфлі коштам ад паўмільёна.

Але адзець выпускніка на ўрачыстасць — сёння толькі палова справы, а то і крыху менш. Ёсць многа іншых выдаткаў. Усе замаўляюць выпускныя альбомы, якія абыходзяцца не менш як у 400 тысяч беларускіх рублёў за асобнік.

— За ўпрыгажэнне адной толькі залы, у якой будзе праходзіць выпускное мерапрыемства для двух класаў, фірма папрасіла больш за 7 мільёнаў, — расказвае Наталля Міхайлаўна. А яшчэ складваліся на паслугі вядучага, на салодкі стол. Выпускнікі пажадалі святкаваць разам з бацькамі і настаўнікамі. На ўсё збіралі яшчэ па два мільёны. Нашы дзеці захацелі падтрымаць традыцыю і пакінуць падарунак школе. Пакуль, праўда, не вырашылі, які, таму не ведаем, колькі давядзецца дадаваць. Адным словам, выпускны — нятаннае мерапрыемства.

Наталля Дзям'янава — брастаўчанка, працуе ў гандлёвай фірме. Для іх з мужам, бацькоў адзінай дачкі, названыя клопаты хутчэй прыемныя, бо выдаткі не вельмі адчувальныя для бюджэту сям'і. Але яна, як актывіст бацькоўскага камітэта, адзначыла, што для некаторых бацькоў з іх класа гэта мерапрыемства стала адчувальным у фінансавым плане.

А як быць бацькам, у якіх адразу тры выпускнікі? — падумала я і згадала сваіх даўніх герояў — сям'ю Селехаў з Кобрына. Пісала пра іх роўна адзінаццаць гадоў таму, калі Вера, Надзя і Люба ішлі ў першы клас. Значыць, дзяўчаты цяпер — выпускніцы.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Марыя Сцяпанаўна, іх мама, сказала, што падрыхтоўка да выпускнога ідзе поўным ходам. Бацькам чацвярых дзяцей, якія атрымліваюць невялікую нават па мерках райцэнтра зарплату, у якіх адзін сын студэнт, вельмі няпроста даецца гэта падрыхтоўка. Выручаюць залатыя рукі Марыі. Яна цудоўна шые. Таму выпускніцы шостай кобрынскай школы Вера, Надзя і Любоў Селехі пойдуць на баль у прыгожых эксклюзіўных сукенках ад уласнага дызайнера. Мама пашыла дочкам таксама карычневыя сукенкі ў стылі 1980-х, якія цяперашнія дзяўчынкі ўзялі за моду надзяваць на апошні званок.

У Кобрыне цяпер робяць выпускныя вечары не з меншым размахам, чым, напрыклад, у Брэсце. Там таксама звяртаюцца да паслуг дызайнераў, каб аформіць залу, наймаюць дыджэяў, арганізоўваюць цэлыя мерапрыемствы з арыгінальным сцэнарыем і вядучымі.

Праўда, для іх, як шматдзетнай сям'і, у якой адразу тры выпускніцы, бацькоўскі камітэт зрабіў пэўную зніжку ў агульных узносах, зазначыла Марыя.

Наўрад ці нешта новае для сябе возьмуць у гэтых нататках цяперашнія бацькі выпускнікоў. А вось тым, хто стане імі налета, можна ўжо сёння падумаць, з якім размахам і на якую суму варта арганізоўваць выпускны вечар.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

■ Вазьму твой боль...

# Я НЕ ВЕРУ Ў АДЗІНОТУ




**«Мне адзінока», — пачынае свой ліст сябар з далёкай краіны. Я адразу думаю пра акіян, які аддзяляе яго ад каранёў, пра менталітэт тамтэйшых жыхароў, пра доўгае блуканне ўдалечыні ад дому. Але наступны радок перакрэслівае ўсе прыдуманыя прычыны: «У мяне падазраюць анкалогію».**

Калі чалавек атрымлівае прысуд ад доктара, ён застаецца сам-насам са страшным дыягназам. Ты і рак — астатні свет перастае існаваць.

За час дабрачыннай дзейнасці ў «Клубе 5000» я бачыла шмат разгубленых матуль, якія толькі што даведаліся, што іх дзіця цяжка хварэе. Іх свет мяняецца за адну хвіліну. Не застаецца нічога больш важнага. І не застаецца нікога больш важнага. У гэтае імгненне яны міжволі перарываюць любыя сувязі са знешнім светам. Бо адчуваюць, што ніхто больш не можа дапамагчы, ніхто не можа ўявіць, не можа зразумець, падзяліць іх гора. Яны адны. Гэта пачуццё маленькай, бездапаможнай кропкі ў глыбокай-глыбокай яме. Пачуццё адзіноты.

Мы, валанцёры «Клуба 5000», стараемся злавіць гэты момант — знаёмімся з сям'ёй падапечных з пылу з жару. Пакуль бацькі яшчэ не апрытомнелі ад навіны, не ўсвядомілі свой новы статус, мы падхопліваем іх і разводзім рукамі: «Паглядзіце, які неабдымны натоўп сабраўся, каб патрымаць вас. Тысячы чалавек гатовы зрабіць для вас самае важнае і неабходнае. Кожны дзень яны побач і падзяляюць ваш боль».

Як важна ў гэта імгненне проста адчуць, што ты не адзін! Як важна не прапусціць гэты момант. ...Тады далейшыя справы пойдуць у зусім іншым настроі, барацьба будзе бойкай, актыўнай. Адзін у полі не воін. А за тваімі плячыма — войска. Пра гэта дастаткова ведаць.

Нядаўна на пошту «Клуба 5000» прыйшоў ліст з просьбай дапамагчы ў платным лячэнні хлопчыка. Я, нічога не абяцаючы, адаслала спіс неабходных дакументаў. Маўляў, дасылайце — паглядзім, праверым і вырашым, што можам зрабіць.

Адказ прымусіў мяне праслязіцца: «Дзякуй вялікі за такі хуткі адказ. Я збяру дакументы, як толькі мы з сынам вернемся з замежнага абследавання. Ведаеце, мне вельмі прыемна, што вы так хутка адрэагавалі. Я адразу адчула, што я не адна. Дзякуй вам».

Не ўсім патрэбны вялікія сумы на лячэнне, не кожнаму прыходзіцца даставаць рэдкія замежныя лекі, многія самі могуць забяспечыць хворае дзіця прадуктамі і падгузкамі, але кожнаму патрэбна падтрымка. Добрае слова, удзел, падбадзёрванне, паляпванне па плячы, поціск рукі, позірк. Проста ведаць, што ты не адзін. Дастаткова ведаць.

Напэўна, таму мой сябар, пачуўшы няладнае пра сваё здароўе, вырашыў даверыцца менавіта мне: «Мне адзінока. Ты дапаможаш?». Ён не хоча палохаць бацькоў, баіцца турбаваць сяброў, у сястры — сям'я. У кожнага сваё жыццё. І раптам ты разумееш, што нікому, па вялікім рахунку, няма спраў да цябе.

Але гэта няпраўда. Ты баішся застацца адзін. Стрэс прыгнятае, наганяе хмары і прымушае бачыць сябе маленькай, бездапаможнай кропкай у глыбокай-глыбокай яме.

Ты не адзін. І нават калі раптам блізкія адмовяцца ад цябе ў цяжкую хвіліну, абавязкова знойдуцца незнаёмыя людзі, гатовыя падзяліць твой боль, узяць на сябе клопаты і выдаткі. «Клуб 5000» кожны дзень даказвае гэта сваімі справамі. Часам мы не знаходзім падтрымкі, таму што проста не верым у яе. А дастаткова толькі верыць.

Кажуць, усе людзі глыбока ўнутры адзінокія. Я думаю пра гэта, калі пачынаю капацца ў сабе (а гэта, на жаль, мой перманентны стан). І так шкадуеш сябе. Здаецца, што ты адзін такі ў свеце. Ніхто не разумее. Ты сам-насам са сваімі тараканамі і душэўнымі балячкамі. Але рана ці позна, у прыдатны ці не вельмі момант, на кожную сваю рэфлексію я знаходзіла брата-двайнятку. Ніхто не зразумее цябе цалкам. Але проста ведай, што ў свеце ёсць хоць адзін чалавек, які перажывае ці калісь перажыў тое самае, што цяпер перажываеш ты. Дастаткова ведаць гэта.

Адзінокімі прынята лічыць людзей, якія жывуць адны. Без сям'і, без пары, без сяброў, без зносін. Маўляў, не пашанцавала: не сустрэў свайго лёсу, сябры здрадзілі, блізкія памерлі. Але ён не апошні чалавек на зямлі. І гэта не адзінота. Гэта яго выбар. Вакол столькі людзей, што сярод іх абавязкова знойдуцца і аднадумцы, і прыяцелі, і палавінка. Дастаткова толькі захацець.

Для сябе я вызначыла адзіноту як сітуацыю, калі няма нікога, каго ты баішся страціць назаўсёды. Страшна не даражыць сваім наваколлем і быць гатовым развітацца з кожным. Але ва ўсім белым свеце столькі людзей, што сярод іх абавязкова знойдзецца хто-небудзь, бясконца дарагі тваіму сэрцу. Дастаткова толькі ўпусціць яго туды.

Мой сябар, напалоханы нечаканым дыягназам, неўзабаве вярнуўся на радзіму. А падазрэнне на анкалогію не пацвердзілася. Затое цяпер ён дакладна ведае, што не адзінокі. Пра гэта дастаткова ведаць.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА,**
**заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000».**

■ Фізкульт-ура!

# Пачыталі — пабегаем

**Многія бацькі надаюць увагу выключна разумовай падрыхтоўцы сваіх дзяцей. Між тым фізічнае развіццё ніяк нельга скідваць з рахунку! Можна нават сказаць, што адно немагчымае без другога. Пагаворым пра тое, што асабліва важна ў фізічнай падрыхтоўцы дашкольніка і школьніка.**

## ДАШКОЛЬНІКУ

Фізічныя нагрузкі дзіцяці дашкольнага ўзросту павінны спрыяць гарманічнаму развіццю арганізма, умацаванню здароўя, а таксама павышэнню фізічных нагрузак перад школай. Якога кшталту нагрузкі тут могуць быць?

**Фізічныя практыкаванні.** Асваенне і паўтарэнне элементарных рухаў, якія няцяжка выконваць.

**Рухавыя гульні.** Спрыяюць нармальным паводзінам і здаровай псіхіцы. Эфектыўная форма — гульні-заданні (загадайце дзіцяці дабегчы да ўмоўнай рысы за пэўны час; дакаціць абруч, каб ён не падаў; хадзіць так, каб утрымаць прадмет на галаве; кідаць мяч як мага вышэй ці далей і інш.). Сюжэтныя гульні з удзелам іншых дзяцей па пэўных правілах выхоўваюць волю, вучаць узгадняць дзеянні з іншымі.

**Ранішняя гімнастыка.** Калі вы самі робіце зарадку, вам, безумоўна, будзе прасцей заахвоціць сваё дзіця. Акрамя практыкаванняў на розныя групы мышц можаце прымяняць хаду і лёгкі бег напачатку і падскокі напрыканцы. У садках гімнастыка прадугледжана з 3 гадоў.

**Спартыўныя захапленні.** Для дашкольнікаў летам ідэальна падыходзяць плаванне, язда на веласіпедзе. Гэта могуць быць наогул практыкаванні з любых відаў спорту, якія трэба выконваць у сваё задавальненне, дзеля добрых уражанняў, а не дзеля дасягнення нейкіх вынікаў.

**Прагулкі.** 1,5-2 гадзіны на дзень. Можна сумяшчаць з рухавымі гульнямі і фізічнымі практыкаваннямі.



## ШКОЛЬНІКУ

Рух з'яўляецца біялагічнай патрэбай арганізма, важным фактарам фізічнага развіцця, захавання і ўмацавання здароўя.

**Задача №1. Палепшыць здароўе, і толькі пасля дабіцца выканання нарматываў школьнай праграмы.**

З улікам стану здароўя і фізічнага развіцця для заняткаў фізічнай культурай школьнікаў дзеляць на тры групы: асноўную (I і II групы здароўя), падрыхтоўчую (III група) і спецыяльную (IV). Колькасць асноўнай фізкультурнай групы няўхільна зніжалася ў апошнія гады і вось ужо звыш 30 працэнтаў студэнтаў-першакурснікаў займаюцца ў спецыяльнай медыцынскай групе.

Дзяцей школьнага ўзросту трэба арыентаваць не на выкананне сярэднеўзроставых нарматываў, а на паляпшэнне асабістых вынікаў. Два ўрокі фізкультуры на тыдзень пакрываюць рухальную актыўнасць дзяцей ўсяго на 40 працэнтаў і не могуць паўнавартасна падрыхтаваць да тэставых заданняў.

**Задача №2. Сфарміраваць патрэбу ў паўсядзённых занятках.**

Для аптымальнага фізічнага і інтэлектуальнага развіцця кожнае дзіця штодня павінна выконваць пэўны аб'ём мышачнай нагрузкі. Школьнікі малодшага ўзросту (7-10 гадоў) павінны прайсці за суткі 15-20 тысяч крокаў, сярэдняга школьнага ўзросту (11-14 гадоў) — 18-25 тысяч крокаў, старэйшыя школьнікі (15-18 гадоў) — 25-30 тысяч крокаў юнакі і 20-25 тысяч дзяўчаты. Гэта магчыма пры штодзённым выкананні фізічных практыкаванняў у другой палове дня цягам 1,5 гадзіны, пажадана пад кіраўніцтвам трэнера.

**Задача №3. Дазіраваць нагрузкі.**

Трэба абмяжоўваць прымяненне вельмі інтэнсіўных і працяглых нагрузак. Да 12-13 гадоў дзецям наогул трэба пазбягаць працяглых нагрузак, паколькі трываласць фарміруецца вельмі павольна і пераважна ў перыяд палавога выспявання. Яны павінны быць нармаванымі. Ранняе заахвочванне дзяцей да заняткаў, якія патрабуюць максімальнай праявы сілы, недапушчальныя.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

### ГРУПА ЗДАРОЎЯ

Стан здароўя дзяцей ацэньваюць з улікам звестак анамнезу (генеалагічнага, біялагічнага і сацыяльнага), узроўню фізічнага і псіхічнага развіцця (і яго адпаведнасці ўзросту), узроўню стану асноўных сістэм арганізма, наяўнасці хранічных захворванняў, заган развіцця. Вылучаюць пяць груп здароўя:

I — нармальнае развіццё без функцыянальных парушэнняў.
II — здаровыя дзеці з функцыянальнымі або невялікімі марфалагічнымі адхіленнямі.
III — хворыя дзеці ў кампенсаваным стане.
IV — хворыя дзеці ў субкампенсаваным стане.
V — хворыя дзеці ў дэкампенсаваным стане.

■ Вусы, лапы, хвост

# СОЛА АД КРЫЛАТАГА



**Што трэба ведаць пры пакупцы дэкаратыўнай птушкі для дзіцяці? Парады давала біёлаг і шчаслівая ўладальніца дваіх зебравых амадзінаў Настасся КУЗЬМЯНКОВА.**



Фота Надзеі БУЖАН.

## Практыкуемся на хвалістых

Перш чым набываць птушку, Настасся раіць бацькам вызначыцца, наколькі іх дзіця адказнае, а яго жаданне ўсвядомленае (увогуле рэкамендуецца набываць такога гадаванца гадоў з 12).

— Абавязкова трэба пераканацца, што гэта не часовы капрыз, інакш бацькі набудуць птушку для сябе, — кажа арнітолаг. — Напрыклад, хвалістыя папугайчыкі любяць кампанію — з імі трэба займацца, інакш яны засумуюць. На гадзіну (а можна і больш) выпускайце птушак палятаць па пакоі, тым больш калі клетка не надта вялікая. Пагуляйце, паразмаўляйце з птушкай, галоўнае — не ігнаруйце яе.

Для першага разу раю выбраць хвалістых папугайчыкаў альбо канарэек: іх прасцей за ўсё трымаць дома. Адразу вызначцеся: хочаце, каб дома гучала песня ці проста жыла птушка? Таксама важна разабрацца — браць аднаго «суседа» ці дваіх? Калі заведзяце аднаго, ён пойдзе з вамі на кантакт, бо будзе шукаць кампанію ў гаспадары. У пары птушкі камунікуюць між сабой, чалавек іх не цікавіць. Разнаполыя гадаванцы ў любым выпадку будуць імкнуцца абзавесціся нашчадкамі. Гэтую акалічнасць абавязкова трэба ўлічваць — з часам спатрэбіцца гнездавы дамок, дзе птушкі зробяць гняздо.

## Каму даверыцца?

Куды пайсці па птушку? Тут ёсць два шляхі — наведаць заакраму альбо звярнуцца да заводчыка. У краме можна набыць усё: птушку, клетку, паілку, купальню, цацкі. Насця папярэджвае, што адразу цяжка высветліць, здаровая птушка альбо не. Існуе месячны карантін: толькі на працягу гэтага тэрміну зразумееце, як пачуваецца ваш гадаванец. Лепей нагледзець птушку загадзя, штодня заходзіць у краму і правяраць, наколькі ёй весела і камфортна. Упэўніўшыся, што ўсё ў парадку, яе можна забіраць. Стандартны набор для заакрамы: хвалістыя папугайчыкі, карэлы, канарэйкі. Хвалістыя папугайчыкі і канарэйкі — самыя бюджэтныя па кошце — ад 200 тысяч рублёў за асобіну. Аднак кенар будзе каштаваць даражэй з-за здольнасці прыгожа спяваць. Ізноў жа, у краме цяжка вызначыць, які ў птушкі ўзрост, хаця старых звычайна не прадаюць. Можна звярнуцца да заводчыкаў, але і яны бываюць розныя: адны разводзяць птушак выключна дзеля грошай, іншыя сапраўды перажываюць за сваіх гадаванцаў.

## Жытло і харчаванне

Клетку лепш браць вялікую, каб птушка мела магчымасць размяць крылы. У цесным доміку яна будзе сумаваць. Знайдзіце аптымальнае месца, дзе не холадна і не горача і пазбягайце скразнякоў: часам гэта можа прывесці да насмарку. Лячыць дэкаратыўную птушку ў Беларусі — справа складаная, бо ў нас няма адпаведных спецыялістаў. Затое на форумах аматараў дэкаратыўных птушак можна знайсці добрыя парады па розных пытаннях, у тым ліку і па лячэнні.

Клетку неабходна прыбіраць як мага часцей — птушка павінна жыць у чысціні. Насця робіць наступным чынам: пасля чысткі апрацоўвае кіпенем — дэзынфіцыруе жытло амадзінаў. Не злоўжывайце хімічнымі сродкамі для прыборкі, раз на месяц паверхню клеткі можна апрацаваць растворам рамонку альбо палыну, яны абсалютна бясшкодныя для птушкі. Кожны дзень мяняйце корм і ваду. Набываючы клетку, не забудзьцеся пра астатнюю «мэблю». Абавязкова павінна быць купальня: птушкі не прапускаюць гігіенічных працэдур.

Чым карміць гадаванца? Можна падрыхтаваць зернявую сумесь з проса, ільнянога насення, магара, канарэечнага насення, аўса. Складнікі сумесі будуць змяняцца ў залежнасці ад віду птушкі. У любым выпадку можна абысціся звычайным пакупным кормам — ён збалансаваны. Дадаткова ў рацыён трэба даваць варанае яйка, някіслы тварог, салодкую садавіну, маладую траўку, несалёныя кашы. Дарэчы, недахоп бялка заўважны: Насця ўзгадвае, як самачка амадзіна з'ела ўласнае яйка. Ні ў якім разе не падкормлівайце птушак са свайго стала: салёнае і тлустае ім забаронена. Не старайцеся перакарміць іх. Памятайце, што кожны від птушак мае свае патрэбы і асаблівасці, у тым ліку ў корме. Не лянуйцеся прачытаць як мага больш інфармацыі пра будучага крылатага сябра, каб не нашкодзіць яму.

## Спробы ўцёкаў ды іншае

Заўжды сачыце, каб фортка ў пакоі была зачыненая.

— Птушкі будуць спрабаваць вылецець, — папярэджвае Настасся. — Падчас аблёту пакоя яны могуць заляцець за фіранку. Убачаць у акне вуліцу — і пачнуць біцца ў шкло.

Пакрысе гадаванцаў можна прывучаць да сябе: спачатку паспрабуйце паставіць кармушку на руку і пачастуйце птушку. Праз некаторы час, калі яна прывыкне да вас, пачынайце даваць корм з рукі. Прыручыць крылатага можна за два месяцы, аднак з ім дзейнічае зваротная сувязь: з'язджаеце надоўга — птушка паспявае адвыкнуць. Іншая справа — адносіны з «малодшымі братамі». Калі спачатку заводзіце птушку, а пасля — кацяня альбо шчаня, то ўсе будуць жыць мірна, бо з дзяцінства прывыкнуць. У адваротным выпадку кот і сабака будуць паляваць — такі ўжо іх прыродны інстынкт.

Для таго, каб вашай птушцы жылося весела, можаце павесіць у клетку некалькі цацак (праўда, гэта больш неабходна папугайчыкам, яны дужа актыўныя і рухавыя). Люстэрка стварыць ілюзію другой птушкі. Але будзьце ўважлівыя: большасць спецыялістаў не рэкамендуе выкарыстоўваць люстэрка. Птушка можа стаць агрэсіўнай з той прычыны, што «сябар» з люстэрка не адказвае ўзаемнасцю і, хутчэй за ўсё, не пачне размаўляць.

## «Кеша харошы»

Звычайна як папугайчыкі, так і канарэйкі распрацоўваюць голас. Тут важна памятаць, што да спеваў больш прыдатныя самцы, самачкі не спяваюць. Будзьце ўважлівымі, бо вас могуць ашукаць і выдаць самачку за самца — такія выпадкі здараюцца часта. Пэўна, вы чулі пра здольнасць да размоў у папугаяў. Для хвалістых гэта найменш характэрна, хоць і яны могуць запамінаць і вымаўляць словы. Ад гаспадара патрабуецца ўпартасць: размаўляйце з птушкай, паўтарайце выразы...Тых жа канарэек лёгка навучыць новым гукам з дапамогай гуказапісу.

Калі крылаты сусед усё ж прывяжацца да дзіцяці, вам забяспечана мора пазітыву: папугайчыкі вельмі ахвотна ласцяцца, казычуць за вушкам, спрабуюць звярнуць усю ўвагу на сябе. Канарэйкі будуць радаваць спевамі. Іншымі словамі, з любой птушкай сумаваць не прыйдзецца.

**Кацярына РАДЗЮК.**

# «МАЁ НАТХНЕННЕ ІГРАЕ НА БУБНЕ»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)**

— А з чым у вас асацыюецца слова «сям'я»?

— З сяброўствам. А сяброўства правяраецца часам. Вось адна дзяўчынка пахадзіла на заняткі толькі два месяцы. Тэлефануе яе мама і абураецца, чаму дачушку ў Парыж не ўзялі. Даводзіцца тлумачыць, што, каб трапіць у Парыж, трэба не два месяцы, а некалькі гадоў пазаймацца. Сям'я — гэта той, хто застаецца. А хто пахадзіў і кінуў толькі таму, што яго не ўзялі ў Парыж, — гэта не сям'я.

## КУПІЦЬ САМЫ ДАРАГІ БАЯН, КАБ СКІНУЦЬ З БАЛКОНА

Сямейны ансамбль Ровенскіх пачынаўся з пяці чалавек. Сёння разам з Дзім Дзімычам і яго жонкай на сцэну выходзяць дачка Марыя і сыны-двайняты Васіль і Віталь, унукі Ліна, Лаліта, Ілона, Дзіма, Мікіта, Соф'я, Цімафей, нявестка Аксана.

— Мы змалку прывучалі дзяцей да беларускай народнай музыкі, — кажа Дзмітрый Ровенскію. — Гэта было нескладана, бо яна заўсёды гучала ў нашым доме. Дзякуючы свайму захапленню мы пабывалі амаль у 40 краінах свету, некалькі гадоў таму перамаглі ў Мінскім гарадскім конкурсе «Сям'я года». Праўда, напачатку некаторых дзяцей даводзілася ўгаворваць займацца музыкай. Прынамсі Віталік у дзяцінстве марыў хутчэй вырасці, купіць самы дарагі ў свеце баян з адной толькі мэтай — скінуць яго з дванаццатага паверха. Але ж цяпер, калі вырас, удзячны, што мы яго прымушалі. Сам іграе, ды яшчэ і дзяцей сваіх заахвочвае займацца музыкай. Сёння музыкантам-прафесіяналам плацяць мізэрныя грошы, таму я не настойваю, каб мае сыны і дачка зараблялі музыкай. Не пярэчыў, калі Марыя пайшла ў журналістыку, а сыны — у будаўніцтва. Прафесіяналам, па сутнасці, засталася толькі ўнучка Лаліта. Захацела яна быць цымбалісткай. Я сумняваўся ў гэтым выбары. Цымбалы — цудоўны беларускі народны інструмент. Але ж у нас закрылі нават фабрыку, на якой іх выраблялі.

Ровенскія робяць усё магчымае, каб ратаваць як мага больш народных інструментаў, якія ахвотна скупляюць у свае калекцыі ў якасці экзотыкі іншаземцы.

— Знаходзім аб'явы людзей, якія хочуць прадаць цымбалы, і набываем іх за свой кошт. У першую чаргу для дзетак з «Дударыкаў». Ад безвыходнасці я і сам узяўся рабіць цымбалы, вось гэтыя (*паказвае*) майструю спецыяльна для ўнучкі.



Фота Надзеі БУЖАН.

## У 12 ГАДОЎ — НА 12 ІНСТРУМЕНТАХ

Да беларускіх народных песняў і танцаў душа Дзім Дзімыча ляжала заўсёды. У 12 гадоў ён ужо іграў ажно на 12 традыцыйных музычных інструментах. І не дзіўна, бо было ў кага: ва ўсіх сваякоў, якія жылі ў розных вёсках Капыльскага раёна, талент біў цераз край.

— Вельмі любіў музыку дзед Фёдар, які працаваў настаўнікам спеваў у школе. Бацька, які прайшоў усю Вялікую Айчынную з шашкай, у якасці самага галоўнага свайго ваеннага трафея прывёз дадому нямецкі гармонік. Менавіта на ім я і вучыўся граць. Мне тады было гадоў пяць. У той час добрыя інструменты каштавалі карову, таму ігралі з суседскімі хлопцамі на ўсім, што пад рукі траплялася:на маслабойцы, піле, касе. Я ў нашым імправізаваным ансамблі быў за барабаншчыка: браў заслонку ад печы і стукаў па ёй драўлянымі лыжкамі. Потым мне купілі тульскі гармонік, на якім усё дзяцінства наярваў на вясковых вяселлях. Першае ў сваім жыцці адыграў, калі споўнілася шэсць гадоў. Жаніўся сусед — Леанід Вілейка. Нядаўна тыя ж самыя жаніх і нявеста расшукалі мяне, каб папрасіць сыграць ужо цяпер на іх залатым вяселлі...

Наш блізкі родзіч Уладзімір Міхайлавіч Давідовіч з вёскі Казакоўка наогул карміўся музыкай. У яго народным ансамблі была задзейнічана ўся сям'я. Іх запрашалі на вяселлі, правады — усе выхадныя былі распісаны на год наперад. Мой бацька таксама ў вольны час іграў у тым ансамблі на трубе. Пазней і мяне туды прывеў. У акрузе нас празвалі «сляпымі», бо Уладзімір Міхайлавіч быў невідушчым і амаль без пальцаў на абедзвюх руках (у яго ў руках разарвалася міна), але іграў на баяне так, што яму маглі пазайздросціць многія музыкі. А слых які ў яго быў адменны! Часта пасля працы я спазняўся на рэпетыцыю, спрабаваў уступіць са сваёй трубой незаўважна, але не атрымлівалася. Дастаткова было ўсяго адзін раз выдзьмуць, як чуўся голас Уладзіміра Міхайлавіча: «А вось і Дзіма прыехаў». Ён ведаў, што гэта іграю менавіта я, хоць нічога не бачыў.

## ЯК ЦЫМБАЛЫ ДЗЕДА «АЖЫВІЛІ»

У тым, што музыка валодае гаючай сілай, здольная здзейсніць цуд, Дзім Дзімыч нават не сумняваецца. Кажа, што ў гэтым пераконваўся ўжо не раз у сваім жыцці.

— Дзядзька майго сябра-гарманіста быў цымбалістам. Яшчэ да рэвалюцыі таксама іграў на вяселлях. На 100-гадовы юбілей мы вырашылі зрабіць яму падарунак. На той час дзед Якаў жыў у Мінску ў сваіх дзяцей і не ўставаў мо гадоў 5. Прыехалі, зайгралі — і не паверылі сваім вачам: стары падняўся, адабраў цымбалы і палачкі. І, што цікава, іграў правільна. Радня дзіву далася: «Дзед прачнуўся». Пасля таго, як ён пайшоў у лепшы свет, яго дзеці перадалі мне вось гэтыя цымбалы першай паловы XX стагоддзя. Дзед Якаў сам іх рабіў, сам на іх іграў.

Калекцыя Дзмітрыя Ровенскага ўражвае: больш за сотню ўнікальных інструментаў: гармонікі, баяны і акардэоны з усіх куткоў Беларусі. Усяго 64 назвы. Узрост некаторых рарытэтаў складае больш за 100 гадоў, ёсць цымбалы 1870 года. Збіраў іх, самааддана ратаваў і рэстаўраваў усё жыццё, уціскаючы сямейныя расходы.

Многія інструменты зроблены рукамі самога Ровенскага — акарыны, дудкі, жалейкі, бубны, барабаны, пастуховая труба.

— Вось на гэтую трубу з цэлага дрэва пайшло ажно 6 гадоў. Каб інструмент загучаў, трэба шмат цярпення і, вядома, укласці ў яго душу.

Непакоіць Дзім Дзімыча лёс калекцыі. Здаецца, сёння ёй і месца знойдзена ў роднай гімназіі, і цікавасць яна выклікае вялікую ў аматараў музыкі. Але пра тое, каб выкупіць яе ў збіральніка, размову пакуль заводзілі толькі іншаземцы.

**Першае ў сваім жыцці адыграў, калі споўнілася шэсць гадоў. Нядаўна тыя ж самыя жаніх і нявеста расшукалі мяне, каб папрасіць сыграць ужо цяпер на іх залатым вяселлі...**

— Ад былога мэра Масквы Лужкова тройчы прыязджалі людзі з прапановамі — у прыватнасці, цікавіла іх тая частка калекцыі, якую складаюць старадаўнія гармонікі. Піцерцы прапаноўвалі мне вось за гэты рарытэтны гармонік (*паказвае*) ажно 7 тысяч долараў. Вы б бачылі іх здзіўленне, калі я сказаў: «Не». «Як гэта не? Гэта ж машына». Былі моманты, калі ў сям'і ў матэрыяльным плане было не ўсё гладка, ледзь не прадаў калекцыю. Але жонка і слухаць не хацела, сказала, ні ў якім разе. Цяпер я ёй вельмі ўдзячны, што стрымала, бо сапраўды, гэта ж наш нацыянальны гонар, ён не вымяраецца ніякімі грашыма. Мару, каб засталося ўсё маё «багацце» на радзіме. Вось Алесь Лось, мой сябра, выкупіў гектар зямлі — зрабіў музей пад Ракавам. І мне хацелася б вывезці сваю калекцыю «на прасторы», бо тут, у гімназіі, яна не змяшчаецца. Інструментаў у мяне больш за 300. Таксама хочацца ўзрадзіць традыцыю фестывальнага турызму: каб гараджане ўсёй сям'ёй ехалі на выхадныя не на банальнае лецішча, а на яркі фестываль, напрыклад, у Глыбокае ці, скажам, у Дуброўна...

**Надзея ДРЫЛА.**

■ На гатовенькае!

# КАЧКА З ЯБЛЫКАМІ ад Настассі ЦІХАНОВІЧ

***Настасся Ціхановіч нарадзілася ў сям'і народных артыстаў Беларусі Ядвігі Паплаўскай і Аляксандра Ціхановіча. Таму не дзіва, што музыка ў яе жыцці прысутнічае літаральна з першых дзён жыцця. Пасля 4-га класа яна паступіла ў Рэспубліканскі ліцэй мастацтваў імя І. Ахрэмчыка, потым у Інстытуце сучасных ведаў атрымала спецыяльнасць прадзюсара ў галіне мастацтваў.***

***Удзел у шматлікіх музычных фестывалях і канцэртных праграмах, перамогі ў розных намінацыях прэстыжных конкурсаў «Хіт-момант», «На скрыжаваннях Еўропы» прынеслі Настассі Ціхановіч заслужанае прызнанне і прыхільнікаў. А пасля тэлевізійнага праекта «Зорны дыліжанс», аўтарам і прадзюсарам якога яна з'яўлялася, спявачка стала вядомай не менш за сваіх бацькоў.***

***Прафесійнае жыццё Настассі насычана шматлікімі паездкамі, гастролямі, творчымі сустрэчамі... А дома яе чакае сын Іван. І ніхто не адмяняў для артысткі абавязкаў маці і хатняй гаспадыні...***

***Якую ролю ў яе жыцці адыгрывае сям'я, чым дапамагаюць ёй блізкія людзі, ці часта збіраюцца яны ўсе разам за сталом, якія кулінарныя ўменні пераняла яна ў спадчыну ад сваіх бабуль — пра ўсё гэта мы гаворым на ўтульнай кухні Настассі ЦІХАНОВІЧ.***



Фота Леаніда МАРЦЫЁНКА.

*— Наогул у мяне вялікая сям'я: мама, тата, бабуля, бабіна сястра і яе муж, цётка, стрыечныя браты і сястра, мой сын Ваня і я...*

*Сямейныя бяседы ў нас здараюцца з нагоды нейкага вялікага свята: Новы год, Раство і Вялікдзень мы стараемся адзначаць разам... Не заўсёды збіраемся дома — можам і ў кавярні, у рэстаране: у залежнасці ад настрою і ад таго, колькі чалавек збіраецца... Проста ж сустрэцца і прыемна правесці вечар — на жаль, такое рэдка атрымліваецца...*

Калі Насця нарадзілася, яе бацькі, у той час удзельнікі вакальна-інструментальнага ансамбля «Верасы», ужо былі надзвычай папулярныя. Яны доўгія месяцы праводзілі на гастролях — ездзілі з канцэртамі па ўсім СССР, выступалі на камсамольскіх будоўлях, удзельнічалі ў розных музычных фестывалях, выязджалі за мяжу... Сярод песень, якія яны выконвалі, была і песня «Я у бабушки живу» Эдуарда Ханка на словы Ігара Шаферана. Песня была вельмі папулярнай, напэўна, таму, што многія савецкія жанчыны, захопленыя актыўнай працоўнай і грамадскай дзейнасцю, не маглі дазволіць сабе не толькі завесці другое дзіця, але і нават гадаваць адзінае. Дзяцей даглядалі бабулі. Зразумела, што гэтая сітуацыя паўтаралася і ў сям'і славутых спевакоў...

*— Вой, было столькі цудоўных людзей, якія гадавалі і кармілі мяне ў дзяцінстве! Па-першае, гэта мае бабулі — Кацярына Ігнатаўна Аўчыннікава, татава мама (яе, на жаль, ужо няма), і Стэфанія Пятроўна Паплаўская, маміна мама. Яны абедзве паказвалі найвышэйшае майстэрства ў кулінарыі. І ежы, смачнейшай за тую, што гатавалі мне бабулі, я не ела і, упэўнена, больш ніколі не пакаштую... Яны гатавалі яе з асаблівым пачуццём — для мяне...*

*І яшчэ хачу сказаць, што ў людзей ваеннага пакалення стаўленне да ежы было асаблівае. Вось, напрыклад, бабуля Кацярына Ігнатаўна... Не паспявала я прыйсці да яе, як першае, што чула з парога: «Мый рукі і садзіся есці!». Усё!.. Прыйсці і не паесці ў бабулі — такое было немагчыма нават уявіць сабе, таму што яна рыхтавалася да майго прыходу і частавала па поўнай праграме... Гатавала такія, здаецца, простыя стравы: бульбяную бабку або нейкае звычайнае мяса на костцы, курынае ці свіное, з бульбай і морквай, — і ўсё было так смачна!*

Трэба сказаць, што Кацярына Ігнатаўна была гераічным чалавекам. У вайну была сувязной у партызанскай брыгадзе імя Канстанціна Заслонава, шмат напакутавалася, прайшла праз гестапа. Яна заўсёды стойка змагалася за жыццё. А пасля вайны працавала на трох работах, пры гэтым паспявала выхоўваць і любіць сына, а потым — яго дачку, якую лічыла сваёй копіяй. Яна, як сапраўдная бабуля, вучыла дзяўчынку жыццёвай мудрасці...

Пашанцавала Насці і з другой бабуляй...

*— Бабуля Стэфанія Пятроўна даглядала і выхоўвала мяне, калі бацькі з'язджалі на гастролі. Яна была са мною дома пастаянна... І сёння памятаю яе цудоўныя памідоры ў слоіках! Цяпер такія не купіш — ні ў краме, ні на кірмашы... А яе асаблівыя беляшы і суп з фрыкадэлькамі!.. Я ўжо слінкі глытаю! Яны — частка майго дзяцінства...*

*Бабуліна сястра, Юзэфа Пятроўна, таксама прымала ўдзел у маім выхаванні і любіла частаваць мяне рознымі прысмакамі, напрыклад, аладкамі, якія яна спецыяльна смажыла маленькімі і чымсьці вельмі смачным іх абсыпала... І ўсё гэта гатавалася з асаблівым цяплом і разуменнем, што гэта будзе есці любімы чалавек...*

Калі з гастроляў вярталіся бацькі, для Насці гэта заўсёды было свята. Зразумела, што яны прыязджалі з падарункамі і пачастункамі для сваёй дачушкі. Гэта былі ласункі, якіх на той час у Беларусі яшчэ не было — жавальныя гумкі, шакаладкі «Марс» і «Снікерс»... Але самае вялікае свята — што побач былі тата і мама. Кароткі час паміж гастрольнымі паездкамі і канцэртамі яны жылі, як звычайная сям'я...

*— І тата, і мама заўсёды добра гатавалі. Але, каб смачна прыгатаваць, на гэта трэба настроіцца і патраціць пэўную колькасць часу. Толькі тады страва атрымаецца... А калі людзі вельмі занятыя, і трэба штосьці згатаваць хутка?.. Тады можна зварыць кашу, напрыклад, грэцкую... Дарэчы, грэцкая каша — самая папулярная страва ў нашай сям'і. Яна смачная і карысная. Тым больш што тут могуць быць розныя варыянты: да грэчкі можна дадаць малака або грыбоў або яна можа быць гарнірам... Вельмі зручная страва: зварыў кашу, і ўвесь дзень можна ўжываць яе ў розных варыянтах...*

*Летам бацькі бралі мяне на гастролі, але там ужо мы елі ў кавярні ці ў рэстаране пры гатэлі...*

Нягледзячы на вялікую колькасць людзей, якія прымалі ўдзел у яе выхаванні, Насця расла досыць самастойным чалавекам і ў падлеткавым узросце ўжо магла сама пра сябе паклапаціцца, сама сябе накарміць.

*— Ужо гадоў з 15—16 я заставалася дома адна, таму што была сур'ёзнай і адказнай дзяўчынкай: мяне цалкам захапіла вучоба, я добра вучылася ў ліцэі. Большую частку дня праводзіла там. Гэта не звычайная школа — разам з агульнаадукацыйнымі прадметамі мы вывучалі шмат музычных. З самага ранку я ішла на заняткі і прыходзіла дадому ўвечары, у лепшым выпадку — а шостай гадзіне... Я сама сабе гатавала ежу — у нас дома было шмат кулінарных кніжак. Чытала іх, штосьці эксперыментавала: «Вой, як цікава!.. Паспрабую гэта прыгатаваць!». Штосьці памятала з таго, што рабіла мама... А вось калі гатавала сур'ёзныя стравы, якія трэба запякаць у духоўцы, напрыклад, мяса ці курыцу, тэлефанавала бабінай сястры і пыталася: «А як гэта гатаваць?.. А што цяпер трэба рабіць?..». І яна мне раіла...*

*Калі ты пачынаеш гатаваць, уменне само па сабе прыходзіць. Часта проста метадам спроб і памылак. Сёння я, як правіла, знаходжу новыя кулінарныя рэцэпты ў інтэрнэце...*

Маючы багаты кулінарны вопыт, спявачцы не цяжка прыгатаваць смачную ежу для свайго сына-школьніка.

*— Ваню кармлю я... З аднаго боку, ён вельмі сціплы ў сваіх патрабаваннях да ежы, з другога — досыць пераборлівы: не ўсе прадукты любіць. Напрыклад, у яго няма паняцця «паесці тваражку»... Ваня проста знешне не любіць яго і есці не будзе. З малочных прадуктаў любіць толькі малако і ёгурт, таму я гатую яму розныя варыяцыі, напрыклад, у блендары змешваю малако і бананы... Гэта добра ўжываецца замест салодкай стравы або цукерак... Але ўсё ж такі Ваня — мужчына, апроч таго, у ім прысутнічае каўказская кроў, таму любоў да мяса і шашлыка ў яго, напэўна, адтуль... Да рыбы сын ставіцца абыякава, і толькі калі мы кудысьці ідзем, у кавярню ці рэстаран, просіць заказаць яму сушы... А дома я звычайна гатую для яго курыцу ці мяса, той жа гуляш, прычым стараюся, каб гэта было смачна — з соусам, з нейкай падліўкай... На гарнір — спагеці, макарона... Сёння яе ў продажы вельмі шмат, у тым ліку для дзяцей — з рознымі фігуркамі... Зразумела, усё лепш гатаваць з натуральных прадуктаў і самой, але ў крамах шмат ужо гатовых смачных соусаў, і я іх выкарыстоўваю... Дарэчы, калі я гасцявала ў сваёй стрыечнай сястры ў Германіі, убачыла там у крамах мноства розных прадуктаў у дапамогу гаспадыням. Напрыклад, гатовы марынад са спецыямі, каб мяса замарынаваць... А ў сястры трое дзетак, гатаваць ёй даводзіцца часта і шмат, вось і прыходзіцца эканоміць час — выкарыстоўваць ужо гатовыя прадукты... Я ўсё гэта падгледзела... Але, праўда, імкнуся не надта захапляцца паўфабрыкатамі. Няхай на абед будзе нешта простае, напрыклад, мяса з прыправамі, але прыгатаванае ўласнымі рукамі...*

Канцэртны графік спявачкі распісаны на 3 месяцы наперад. Але ў яе заўсёды знаходзіцца час, каб сустрэцца за адным сталом з сябрамі і, тым больш, з роднымі людзьмі. На той выпадак, калі яна прымае гасцей дома, у яе прыхавана некалькі сваіх, фірменных кулінарных рэцэптаў...

*— Звычайна, калі мы сустракаемся з сябрамі, то ідзем у якую-небудзь кавярню... Але ёсць такія моманты ў жыцці, калі я сама гатую для гасцей, і мне гэта вельмі прыемна... Такое здараецца, калі да мяне прыходзяць самыя блізкія людзі — мая сям'я.*

*Часцей за ўсё я гатую качку з яблыкамі. Чаму менавіта яе?.. Па-першае, звычайна сямейным колам мы збіраемся на Раство. А па-другое, калісьці, некалькі гадоў таму, я вырашыла згатаваць качку, і яна атрымалася вельмі смачная і ўсім дужа спадабалася!..*

*Качку купляю ў супермаркеце. Звычайна яна прадаецца замарожаная. Зразумела, птушку трэба размарозіць, памыць, ачысціць... Адначасова з качкай купляю і замарожаныя брусніцы. Вядома, можна адразу купіць гатовае бруснічнае варэнне, але мне цікавей самой перацерці ягады з цукрам у блендары (калі няма блендара, можна і на мясарубцы перакруціць). Цукар бяру на вока: тут хто як любіць — нехта салодкае, хтосьці больш кіслае. А я люблю, каб брусніцы былі і не салодкія, і не кіслыя.*

*Качку трэба нацерці прыправамі, можна крышку пасаліць. Хаця я не салю — гэта страва на смак павінна быць не салёная, а востра-салодкая... Потым падрыхтаваным бруснічным соусам націраю птушку, кладу яе на бляху, абкладваю яблыкамі, дадаю крыху алею і стаўлю ў духоўку.*

*Пакуль качка пячэцца, я пастаянна сачу, каб яна не падгарэла... Калі з птушкі пачынае выдзяляцца сок, я гэтым сокам яе час ад часу паліваю. Чым часцей паліваеш, тым смачней будзе. Тушыцца яна доўга — не менш за дзве гадзіны на маленькім агні даходзіць да кандыцыі. І потым, калі бачу, што птушка ўжо гатовая, выключаю агонь, але яшчэ нейкі час не вымаю яе з духоўкі.*

*На стол падаю качку цэлую — каб кожны з гасцей мог выбраць сабе кавалачак, які захоча... Дарэчы, сок з алеем, у якім тушылася качка, можна наліць у талерачку і мачаць туды кавалачкі мяса з запечанай скурачкай ці паліць ім гарнір... Смаката!*

**Падрыхтавала Тамара БУНТА.**

**У КУЛІНАРНЫ БЛАКНОТ:**

***Спатрэбіцца**: 1 качка, 100 г алею, бруснічнае варэнне ці брусніцы, перацёртыя з цукрам (колькасць варэння залежыць ад памераў качкі), 2-3 яблыкі, соль, прыправы — на смак.*

*Качку ачысціць, нацерці невялікай колькасцю солі, прыпраў, бруснічным варэннем і пакласці на бляху ці ў патэльню. Яблыкі парэзаць на часткі, вынуць асяродак і «акружыць» імі качку. Некалькі крышэнікаў можна пакласці ўсярэдзіну. Дабавіць алею і паставіць у разагрэтую духоўку. Пячы каля 2 гадзін, перыядычна паліваючы сокам, які выдзяляецца з птушкі падчас гатоўкі.*



*На стол падаваць з бруснічным варэннем. Можна пасыпаць зверху свежым кропам.*

*Добрым гарнірам да качкі з'яўляюцца вараная бульба і грэцкая каша.*

## ВЯСЁЛЫ СНЯДАНАК ДЛЯ НЕХАЧУХІ

**«Не хачу!», «Не буду!», «Нясмачна!»... Часам, каб накарміць маленькае пераборлівае дзіця, трэба вельмі пастарацца! Але дзеля гэтага зусім не абавязкова гатаваць нейкія складаныя стравы ці эксперыментаваць з рэцэптамі. Трэба проста праявіць крыху фантазіі. Напрыклад, самы звычайны сняданак можна аформіць так, што дзіця з задавальненнем з'есць яго.**

**Варыянт 1.** Салодкі перац разрэзаць напалам, ачысціць ад зярнят і адрэзаць два кольцы. Затым пакласці іх на патэльню, у цэнтр кольцаў разбіць яйкі і падсмажыць. Атрымаецца вясёлая яечня. Са звычайнай сасіскі можна зрабіць васьмінога: перад тым, як яе адварыць, трэба зрабіць некалькі надрэзаў-ножак прыблізна на 2/3 сасіскі. Калі «васьміножак» зварыцца, намаляваць яму вочкі і рот кетчупам ці смятанай.



І яшчэ зрабіць бутэрброд-парася. На кавалачак хлеба пакласці вялікі скрылік каўбасы — гэта будзе галава. Меншы скрылёк, які трэба пакласці зверху, — нос. З сыру выразаць вушкі-трохвугольнікі, а кетчупам намаляваць вочкі, ноздры і рот.

**Варыянт 2.** Пакласці на талерку скрылёк каўбасы, а вакол яго пакласці спагеці — быццам шавялюра. Намаляваць кетчупам вочкі, носік і рот або зрабіць іх з кавалачкаў перцу, памідора, агурка. З пятрушкі — банцік. Атрымаецца забаўны чалавечак!..



Паверце, ваша дзіця не адмовіцца ад такога вясёлага сняданку!

**МАРЫНА ХАРЫТАНОВІЧ. Фота аўтара.**

Сямейная газета
28 мая 2015 г.

■ 50+: ЖЫЦЦ ЦІКАВА

# КАЛІ ДУША ПАТРАБУЕ...

## 75-гадовы мінчанін у якасці інструктара водзіць у паходы ўсіх ахвотных

**Пётр Мяфодзьевіч Талабчук калі на што хворы, дык на турызм. Прычым закахаўся ў рамантыку падарожжаў, вогнішчы і начоўкі ў намётах ён яшчэ ў раннім юнацтве, у арміі. І пранёс гэтую любоў праз усё жыццё. Да гэтага часу ходзіць у паходы — у любое надвор'е! І не проста ходзіць сам — у якасці інструктара водзіць усіх, хто хоча. Ён упэўнены, што няма дрэннага надвор'я, ёсць дрэнная экіпіроўка...**


Удзельнікі рэспубліканскага турыстычнага злёту на рацэ Віліі.

### ПРЫРОДА ЛЕЧЫЦЬ

Стройны, усмешлівы, вельмі рухавы... Няўжо ў такім сур'ёзным узросце можна быць такім бадзёрым, энергічным і нават адціскацца ад падлогі больш разоў, чым некаторыя маладыя мужчыны? У Пятра Талабчука няма ніякіх сакрэтаў. Ні грама спіртнога за ўсё жыццё, ніводнай цыгарэты і пастаянны рух — вось слупы, на якіх трымаецца здароўе, лічыць ён. А яшчэ прырода, лес...

**«Іншыя інструктары перадавалі «па ланцужку», што ёсць у групе такая Паліна Міхайлаўна, да яе патрэбен адмысловы падыход... А я заўсёды толькі ўсміхаўся: маўляў, я з ёй спраўлюся»**

Прырода наогул можа здзяйсняць цуды, упэўнены наш герой. Яна можа вылечыць любое, нават самае страшнае захворванне. І прыводзіць у прыклад гісторыю былога ліквідатара аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі. Мужчына быў моцна апрамененны ў 1986 годзе, пасля чаго захварэў на рак. Калі даведаўся пра свой дыягназ, сабраўся і паехаў жыць у Крым, літаральна ў дзікіх умовах. Вырашыў для сябе: выжыву дык выжыву, а не — дык не.

Ён пасяліўся побач з Лісінай бухтай (Пётр Мяфодзьевіч добра ведае тое месца, неаднаразова бываў там у паходах). Дык вось, гэты ліквідатар паставіў там самаробную палатку — нават не палатку, а фактычна толькі навес ад дажджу з цыраты, пад ім і спаў... Сілкаваўся чым папала, даходзіла да таго, што часам шукаў хлеб на сметніках. Але кожны дзень у любое надвор'е купаўся ў моры і маліўся Богу... Правёў так год, і што вы думаеце — ачуняў!

Пасля гэтага ён вярнуўся ў Мінск і неяк адправіўся ў паход з адной з груп выхаднога дня, дзе Пётр Мяфодзьевіч быў інструктарам. Пётр Талабчук пачуў гэтую гісторыю ад яго самога.

### ДАЎ САБЕ ЗАРОК: НЕ БУДУ ПІЦЬ НІ КРОПЛІ

Сам Пётр Мяфодзьевіч нарадзіўся ва Украіне — у вёсцы Гірнікі Ровенскай вобласці. Кажа, што пасля школы працаваў у калгасе — пасвіў кароў. Пуцёўку ў жыццё маладому чалавеку дала армія. Але і з п'янствам ён упершыню сутыкнуўся менавіта там. «Адразу ж даў сабе зарок: не буду піць ні кроплі», — успамінае ён. І стрымаў сваё слова! Кажа, што нават жонка часам можа ў свята выпіць. На турзлётах таксама не абыходзяцца без спіртнога. Але ён непахісны: ніколі і ні пры якіх абставінах не перакуліць чарку ў рот. «Мне і без гэтага добра, — смяецца. — Навошта сябе атручваць? Жыццё прыгожае і цікавае і без гэтага».

Успамінае, як пазнаёміўся з жонкай: было гэта ў Харкаве на катку ў далёкім 1963 годзе. «У нас як было: калі дзяўчына спадабалася, мы з сябрам «пад'язджалі» да яе з двух бакоў і бралі пад рукі, так што нікуды ёй не дзецца — даводзілася знаёміцца. У каго размова з ёй завязвалася — той заставаўся, а другі адыходзіў, каб не перашкаджаць», — усміхаючыся, распавядае ён.

У 1964-м маладыя людзі пажаніліся. А праз два гады пераехалі ў Мінск. Тут Талабчук скончыў інстытут народнай гаспадаркі і ўсё жыццё прапрацаваў забеспячэнцам. Аб'ездзіў з камандзіроўкамі ўвесь былы Савецкі Саюз. А Беларусь лічыць сваёй другой радзімай...

Дарэчы, пераехаўшы ў Мінск, перш за ўсё ён пачаў шукаць мясцовы турклуб. Літаральна адразу ж пазнаёміўся з Валянцінам Таўкачовым, які пасля стаў галоўным ідэолагам грамадскай арганізацыі, што аб'ядноўвае тых, хто за цвярозы і здаровы лад жыцця, — «Цвярозасць-Аптымаліст». Яны сталі сябрамі. У 1980-х гадах Пётр Мяфодзьевіч скончыў курсы інструктараў па турызме, вывучыў маршруты і стаў вадзіць групы выхаднога дня. Яны былі вельмі папулярныя тады ў мінчан. З вакзала кожныя выхадныя стартавалі дзве групы: так званыя «скараходы», якія ішлі на 20-25 км, і «пачаткоўцы» і турысты з дзецьмі. Збіраліся а 8-й раніцы пад гадзіннікам...

— Я вадзіў пачаткоўцаў, — расказвае Пётр Мяфодзьевіч. — Памятаю, сярод іх была Паліна Міхайлаўна. Яна заўсёды ўсім была не задаволена, вечна бурчала. Але я хутка знайшоў спосаб яе «нейтралізацыі». Усяго толькі трэба было падысці, абняць, нават пацалаваць можна было па-сяброўску: «Паліна Міхайлаўна, ну што вы?» «Гэта, дарэчы, самы просты спосаб уціхамірыць самую шкодную жанчыну, — упэўнены мой суразмоўца. — І яна больш ніколі пры мне не бурчала... Нас, інструктараў, было шмат, мы ўвесь час мяняліся. Іншыя інструктары перадавалі «па ланцужку», што ёсць у групе такая Паліна Міхайлаўна, да яе патрэбен адмысловы падыход... А я заўсёды толькі ўсміхаўся: маўляў, я з ёй спраўлюся...

— А жонка не раўнавала?

— Ніколі! Ды я і яе да паходаў далучыў, мы разам хадзілі...

Пётр Мяфодзьевіч кажа, што жонцы ніколі не здраджваў. Проста нейкая прыроджаная душэўная ахайнасць не дазваляла...


Сёлета ў лясным паходзе на свята Дзень абаронцаў Айчыны. Пётр Мяфодзьевіч — справа ў салдацкай гімнасцёрцы.

### МЕСЦА СУСТРЭЧЫ — ТРЭЦІ ВАГОН АД ПАЧАТКУ ЦЯГНІКА

— У 1990-х гадах у нашы паходы хадзіла шмат моладзі. Цяпер — у асноўным пенсіянеры, а моладзь уся ў камп'ютарах. Душа баліць: пакуль мы жывыя, гэта ёсць. Нас не стане, і гэта ўсё знікне, — крыху смуткуе Пётр Мяфодзьевіч. — Я ў лесе як дома. У любое надвор'е вогнішча за пяць хвілін распалю. Узімку праз 20 хвілін у мяне будзе вада ў кацялку кіпець...

Цяпер у паходы разам з маім суразмоўцам ходзіць па 40-50 чалавек, сярэдні ўзрост — 60 гадоў. «Нават адна невідушчая жанчына кожную нядзелю прыходзіць, — дзеліцца ён. — А як пачула, што вочы карысна падстаўляць пад дым, стала садзіцца заўсёды бліжэй да агню. Цяпер кажа, што бачыць жоўты колер, а раней толькі цемру»...

— Я заўсёды раюся са сваімі турыстамі, колькі кіламетраў прайсці, ды і ва ўсіх астатніх пытаннях, — дзеліцца Пётр Талабчук. — Мы нікуды не спяшаемся. Шмат глядзім па баках і абмяркоўваем усё, што бачым. Я вырас ва Украіне каля лесу і ведаю кожную травінку і кожную птушачку. Мы фатаграфуем расліны, расказваем пра іх. Напрыклад, чаму ў медуніцы кветкі рознага колеру, ад якіх хвароб яна можа дапамагчы... Вызначаем па спевах, якая птушка перад намі. Звычайна людзі, акрамя вароны і сарокі, ніякіх не ведаюць. Я, напрыклад, шмат чытаў, цікавіўся, і таму шмат ведаю аб паводзінах птушак, разумею, што азначаюць розныя тыпы спеваў. І ўсім гэтым дзялюся з людзьмі. Прыходзяць людзі, якія калісьці са мной у паходы хадзілі, потым на 10-15 гадоў зніклі з поля зроку: хто старых даглядаў, хто хварэў. Кажуць: «Як жа я сумаваў». Я іх усіх памятаю і кожнаму рады.

Праўда, цяпер, калі пачаўся дачны сезон, паходы часова будуць прыпынены. «У апошні, як правіла, мы ідзём у другую нядзелю мая, а потым — перапынак на лета», — кажа Пётр Мяфодзьевіч. Хоць планы ў яго па-ранейшаму велізарныя. У чэрвені выедзе ў Оршу, у мясцовае аддзяленне «Аптымаліста» на злёт «Дняпроўскія зоры». А 3 ліпеня разам з «Аптымалістам» збіраецца на смаргонскія Блакітнае і Чорнае азёры на 3-4 дні, разам з літоўскімі аднадумцамі.

— Але і летам, бывае, не вытрымліваю, сумна становіцца на лецішчы, — усміхаецца Пётр Мяфодзьевіч. — І я кажу жонцы: прабач, не магу, душа патрабуе... І ў нядзелю іду на наша звычайнае месца збору: а раптам нехта прыйдзе таксама? І заўсёды хто-небудзь ды прыходзіць!

— У мяне проста любоў да людзей нейкая пасля гэтых паходаў з'явілася, — кажа Пётр Мяфодзьевіч. — І яны гэта бачаць. Калі мяне нехта крыўдзіць — я проста сыходжу, бо даказваць камусьці нешта бессэнсоўна. А сварыцца — навошта? Я прыношу людзям радасць, а людзі прыносяць радасць мне.

Ён адкрыты і просты, вельмі таварыскі. Пра такіх кажуць: лёгкі характар. Да такіх цягнуцца іншыя людзі. А ўжо як яму дзякуюць пенсіянеры за актыўныя выхадныя на прыродзе, за добрую кампанію замест адзіноты ў кватэрах!

Для мінчан паведамляем: вы таксама можаце восенню далучыцца да паходаў. У нядзелю з чыгуначнага вакзала адпраўляецца электрычка на Маладзечна ў 9.52. Месца сустрэчы — трэці вагон ад пачатку цягніка.

**Святлана БУСЬКО.**

## Актывісты жывуць лепш, чым дамаседы

**Пенсіянеры валодаюць выдатным патэнцыялам і здольнасцю адаптавацца ў сучасных умовах — так лічаць і сацыёлагі, і медыкі.**

Калі паглядзець на стыль жыцця пенсіянераў, то ўсё старэйшае пакаленне можна падзяліць на дзве катэгорыі: актыўных і пасіўных. Адрозніваюцца яны літаральна ва ўсім. Першыя працягваюць працаваць, другія — не. Прычым большасць «актыўных» не адчуваюць патрэбы ў фінансавай дапамозе, тады як сярод «пасіўных» такія складаюць вельмі малую частку.

Што тычыцца фізічнага самаадчування, то «пенсіянерам-актывістам» жывецца лепш, чым дамаседам. Асноўны занятак пасіўных пенсіянераў — прагляд тэлеперадач і хатняя гаспадарка. Актыўныя ж карыстаюцца камп'ютарам, «сядзяць» у інтэрнэце, вядуць рухомы лад жыцця і рэгулярна размаўляюць па мабільным тэлефоне.

Ёсць меркаванне, што людзі старога ўзросту фізічна слабеюць, многія віды працы ім проста не пад сілу. Але гэта не зусім адпавядае рэчаіснасці. Не варта блытаць прычыну і вынік. У большасці выпадкаў чалавек слабее, калі ён адчувае сябе непатрэбным.

Калі ж пажылыя людзі запатрабаваныя, у іх з'яўляюцца сілы жыць паўнавартасна і яны даўжэй захоўваюць бадзёрасць цела і духу. Так што старая песня не хлусіць, і — гады сапраўды могуць быць багаццем.

## Сталічныя ветэраны не застаюцца без увагі

**У Мінску сёння пражываюць 4292 ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і 3178 асоб, якія пацярпелі ад наступстваў вайны. Акрамя пенсій, усе яны штомесяц атрымліваюць сацыяльныя дапамогі (у памеры мінімальнай пенсіі па ўзросце).**

Таксама ў сталіцы прадугледжана фактычнае пакрыццё сродкаў, якія ветэраны выдаткавалі на рамонт жылля, у памеры пяці бюджэтаў пражытковага мінімуму. Адзін раз на тры гады яны, а таксама члены сем'яў загінулых у Вялікай Айчыннай вайне маюць права бясплатна аздаравіцца ў рэабілітацыйным цэнтры «Элеас».

Сёлета больш за 430 мінскіх ветэранаў былі замацаваны за арганізацыямі для аказання ім шэфскай дапамогі. Таксама пажылыя людзі падалі заяўкі на надомнае сацыяльнае абслугоўванне, аказанне паслуг сядзелкі, праходжанне лячэння ў рэабілітацыйным цэнтры «Элеас». Як адзначаюць спецыялісты, некаторыя ветэраны мелі патрэбу ў матэрыяльнай, юрыдычнай і псіхалагічнай дапамозе. Адначасова многія з іх актыўна запісваліся ў гурткі па інтарэсах, на камп'ютарныя курсы.



■ Пункт гледжання

**Сёння нікога не здзівіш татам з дзіцем на руках. Ці 25-гадовай жанчынай, якая робіць кар'еру і плануе завесці сям'ю праз год ці два. За апошнюю сотню гадоў сістэма ўзаемаадносін паміж татам, мамай і дзіцем змянілася кардынальна. Думкамі, чаму так адбылося і што можа зрабіць сучасны шлюбны саюз сапраўды шчаслівым, дзеліцца перынатальны псіхолаг Кацярына ШАВЯЛЁВА.**

# ПУП СЯМ'І

## Чаму ў XXI стагоддзі дзіця выходзіць на першы план?



### НАРАДЖАЦЬ ЦІ ПРАЦАВАЦЬ?

Дваццатае і дваццаць першае стагоддзе ўвяло ў свядомасць жанчыны дысбаланс. Мацярынства заўжды было неад'емнай часткай яе жыцця. Дакладней, яго нязменнай асновай. І калі паклясці сям'ю і самарэалізацыю на шалі, то першая перамагала. Але цяпер сітуацыя цалкам змянілася. Мацярынства перастала быць пераважнай каштоўнасцю. На першы план выйшла жаночая самарэалізацыя.

Раней жанчына не магла не працаваць, рана выходзіла з дэкрэтнага адпачынку. Так ёй дыктаваў савецкі ўклад жыцця. Цяпер жа мы жывём параўнальна свабодна. Знешнія абставіны не прымушаюць цалкам аддавацца працы. І таму шалі з каштоўнасцямі сапернічаюць паміж сабой. У той жа час трэба разумець, што мацярынства закладзена ў жаночай прыродзе. А самарэалізацыя — штосьці прыўнесенае звонку. І многія дзяўчаты ставяць на першае месца менавіта яе. Хоць не да канца разумеюць, што мацярынства і самарэалізацыя неадрыўна звязаны паміж сабой, а не ўзаемавыключаюць адно аднаго. З нараджэннем дзіцяці маці непазбежна адкрывае ў сабе новыя здольнасці, у тым ліку і душэўныя. З'яўляецца стымул станавіцца яшчэ лепшай. Тая ж самарэалізацыя, толькі ўжо іншай якасці.

### «ТЫ І ТОЛЬКІ ТЫ...»

Жанчыны цяпер мала нараджаюць. Але калі дзіця з'яўляецца на свет, яно становіцца самым дарагім, што ёсць у маці. Яе рашэнне выпакутавана, прадумана дзясяткі разоў. І гэта моцна ўздзейнічае на адносіны паміж маці і дзіцем. Мамы кажуць: «Я хачу даць яму ўсё». І яна сапраўды дае. Толькі месца для дзіцячай ініцыятывы ўжо не застаецца.

Між тым мацярынскія адносіны — гэта адносіны дваіх. І сёння ў іх дзіцяці вельмі мала, а мамы зашмат. Менавіта яна арганізоўвае мерапрыемствы, забаўляе, водзіць у гурткі. А дзе ж дзіцячая самастойнасць?

Увогуле ў сучасных маленькіх сем'ях дзіця надаецца звышкаштоўнасць. Яшчэ ў мінулым стагоддзі яно было часткай сям'і. Сёння — гэта абсалютны цэнтр. Для аднагадовага дзіцяці гэта натуральна, таму што яно бездапаможнае. Пасля гэтага ўзросту дзіця павінна набываць самастойнасць. Інакш яно становіцца самамэтай бацькоў, а не спрадвечным працягам чалавечага роду.

Да таго ж дзіця не разумее, што ў мамы можа быць уласнае жыццё, свае справы. Што бацькі могуць бавіць час адно з адным. Адсюль і праблема, што праз гіперапеку цяжка становіцца адпусціць дзіця ў дарослае жыццё. У яго няма звычкі прымаць самастойныя рашэнні, бо ўсё раней вырашалі мама і тата. І калі з цягам часу прыходзіцца аддзяляцца ад сям'і, то захоўваецца ранейшы ўплыў бацькоў. Так часта ўзнікае рэўнасць да выбранніка сваёй ужо даўно немаленькай дачкі. Згодна са статыстыкай, наяўнасць адзінокай цешчы павялічвае верагоднасць разводу на 60%.

### «КАХАНЕНЬКІ-РОДНЕНЬКІ!»

Сённяшнія бацькі выйшлі з савецкай сістэмы. У такіх сем'ях панаваў недахоп блізкага эмацыянальнага кантакту. Раней паміж дзецьмі і бацькамі была вялікая дыстанцыя. Старэйшыя ўвесь час былі занятыя сваімі справамі. Гэта давала дзецям шмат самастойнасці, але ў той жа час недадавала ўвагі. Мала тактыльных кантактаў — абдымкаў і пацалункаў. А для дзіцяці, каб яно разумела, што яго любяць, неабходна іх мага больш. І гэта выклікала эмацыйны голад. Памятаеце, раней казалі: «Не бяры на рукі, разбэсціш!», «Не кармі доўга грудным малаком — прывыкне». Адсюль і эмацыянальная няздольнасць паразмаўляць па шчырасці з блізкімі, вырашыць на словах нейкія набалелыя праблемы.

А будучыя бацькі выйшлі з гэтым недахопам пачуццяў у дарослае жыццё. І яны кажуць: «Нам не хапала любові. Са сваімі дзецьмі ў мяне ўсё будзе наадварот». Але кідацца ў крайнасці заўжды небяспечна. Напрыклад, маці можа вадзіць за руку 12-гадовае дзяўчо. А ў гэты час дачка думае: «Калі мама бярэ мяне за руку, значыць, я слабая, ні на што не прыдатная». Гэта называецца «навучаная бездапаможнасць». Такія дзеці нават у краму не могуць схадзіць самі. Яны губляюць веру ў сябе. Такая гіперапека прыносіць адны няшчасці.

### ХТО Ў ДОМЕ ГАЛОЎНЫ?

Таты сёння задзейнічаны ў выхаванні дзяцей. Дзякуючы гэтаму адносіны паміж дзіцем і ім ствараюцца з самага нараджэння. Раней такой традыцыі не было. Тата звяртаў увагу на дзіця, калі таму станавілася 3-4 гады і яно пачынала размаўляць. А цяпер узаемаадносіны фарміруюцца значна раней. І гэта нясе ў сабе больш станоўчых рыс, чым адмоўных.

Муж і жонка выхоўваюць дзіця разам. У іх ёсць агульная справа, ёсць пра што пагаварыць. Атрымліваецца своеасаблівая прафілактыка шлюбных крызісаў.

Увогуле сучаснаму пакаленню складана адказаць на пытанне «Навошта патрэбен тата? Што ён дакладна павінен рабіць?». Разуменне яго функцый цяпер даволі размытае. Гэта тлумачыцца нядаўнім укладам жыцця. У XX стагоддзі жанчыне давялося займаць ролю мужчыны. Ва ўсім. І выконваць бацькоўскія функцыі таксама: выхоўваць дзіця, караць, накіроўваць яго па жыцці. Такім чынам жанчына выцесніла мужчыну і амаль заняла яго месца. З цягам часу ён да гэтага адаптаваўся і прывыкла. І вельмі часта пары разводзяцца таму, што мужчына спрабуе быць татам, а жанчына не дае яму гэтага зрабіць, не пускае.

Адсюль і жаночае «няправільна». Тата і апранае дзіця не так, і выцірае пасля ванны, і выхоўвае яго неналежным чынам. Але ён робіць гэта, як мужчына. А жонка прад'яўляе да яго патрабаванні, як да жанчыны. Таму што не разумее, у чым значэнне таты. Раней была песня «Тата можа ўсё што заўгодна». А цяпер «плаваць брасам, спрачацца басам, дровы секчы» і мама можа. А тата павінен адчуваць павагу, атрымліваць першы кавалак за вячэрай. А з чаго б гэта, калі мама на ўсё і без яго здольна?

### КОЖНАМУ СВАЁ МЕСЦА

Жанчыне па сваёй прыродзе цяжка кантраляваць усё вакол. Яна хутчэй скіравана да свайго мікрасвету — дому. А вось мужчына наадварот: ён прадстаўляе сям'ю па-за яе межамі, у знешнім свеце, ён менш эмацыйны. Напрыклад, з пакараннем. Мужчына насварыўся, а праз 5 хвілін ужо супакоіўся, забыў. А мама ў той жа сітуацыі будзе хадзіць і перажываць.

Тата — гэта абаронца сям'і. Раней, напрыклад, прафесію для дзіцяці выбіраў тата, накіроўваючы яго па жыцці. А мама адказвала за эмацыйны стан. Яна заўжды пашкадуе, прылашчыць, даруе, пахваліць. А тата ацэньвае здольнасці дзяцей ужо больш строга. Тата вучыць розным відам дзейнасці, а не мама. На ровары катацца, напрыклад. Так фарміруецца сямейная іерархія: тата, мама, крыху ніжэй дзеці. І калі ў жанчыны ёсць павага да свайго мужа, то дзеці аўтаматычна стануць пераймаць гэту мадэль адносін і будуць слухацца мамы.

Калі я працую з парамі, то бяру за ідэал менавіта гэту форму дзіцяча-бацькоўскіх адносін. Як паказвае практыка, у такіх сем'ях больш шанцаў стаць шчаслівымі.

**Запісала Вераніка ПУСТАВІТ**

■

## Прэм'ера рубрыкі: «НАТАТКІ ТАТКІ»



*Мужчынам не дадзена адчуць новае жыццё пад сваім сэрцам. Часцей за ўсё першае слова дзіцяці — не «тата». У дэкрэтны водпуск наш брат таксама ходзіць рэдка, таму, на жаль, мы прапускаем большасць яркіх момантаў, звязаных з тым, як дзеці пазнаюць свет. І хоць таты не абмяркоўваюць на форумах колікі, прыкормы і першыя зубкі, гэта зусім не азначае, што мы нічога не ведаем пра тое, як растуць нашы дочкі-сыночкі. Таксама хваляемся, клапоцімся, ганарымся, бываем самымі шчаслівымі і часам не стрымліваем эмоцый. Толькі робім гэта па-свойму, з улікам папраўкі на мужчынскі характар...*

# ЛЯЛЬКА ЦІ НЯНЬКА

**Перыяд ад станоўчага выніку тэсту на цяжарнасць да ўльтрагукавога даследавання, падчас якога становіцца вядомым пол дзіцяці, для большасці сям'яў, безумоўна, напружаны і інтрыгуючы. Тэарэтычна ўсе родныя шчыра рады і ў адзін голас сцвярджаюць: няма аніякай розніцы — хлопчык ці дзяўчынка, галоўнае, каб здароўе было. На практыцы ж усе разбіваюцца на два ўмоўныя лагеры. У адных безліч аргументаў за дзяўчынку, другім патрэбен хлопчык. Як на традыцыйнай вясельнай забаве, калі збіраюць грошы на першынца. Кожны разумее, што ад яго нічога не залежыць, але ўтрымацца ад дыскусіі не можа.**

У нас з жонкай да яе цяжарнасці наконт гэтага пытання было поўнае разуменне: аднолькава будзем рады і хлопчыку, і дзяўчынцы. У дзень жа, калі першы, другі і трэці тэст паказаў «дзве рысачкі», гэтая гармонія пахіснулася. Адчуванне рэальнасці моманту развяло нашы погляды наконт першынца ў розныя бакі. Як ні дзіўна, жонка хацела хлопчыка, а я — дзяўчынку. Гэта ніяк не звязана з захапленнем парадку «нянька — лялька» ці нейкімі нерэалізаванымі амбіцыямі бацькоў. Я ніколі не марыў выгадаваць футбаліста. Не складаў сабе і амбітных планаў наконт дзяўчынкі. Проста на падсвядомым узроўні было адчуванне: нараджэнне дзіцяці — гэта эмацыйны выбух. Калі ты перажываеш гэта ўпершыню, то вельмі склада кантраляваць фантан пяшчоты, які б'е акурат з тваёй душы. Тым часам усе гэтыя неабмежаваныя «усі-пусі» ніяк не ўпісваюцца ў маю канцэпцыю выхавання хлопчыка. Зусім іншая справа з дзяўчаткамі. Меркавалася, што з імі можна не саромецца сваіх эмоцый і не турбавацца наконт выпрацоўкі мужчынскай стрыманасці ў характары.

Жонка ж лічыла, што старэйшы павінен быць менавіта хлопчык — патэнцыйны абаронца для малодшай сястрычкі. Безумоўна, свой адбітак накладвала і нерэалізаваная мара яе бацькі. Дарэчы, на нашым вяселлі падчас згаданага вышэй конкурсу ў лідарах былі ружовыя паўзункі, але ў апошні момант цесць партрэтам 18-га прэзідэнта ЗША забяспечыў пераканаўчую перамогу патэнцыйнаму хлопчыку.

Вось так, прыдумляючы ўсё новыя і новыя аргументы ў падтрымку сваіх пазіцый, мы чакалі УГД, якое павінна было расставіць усе кропкі над «і».

БЕЗУМОЎНА, прапусціць такі момант я проста не мог, таму на ўльтрагук пайшлі разам. Ля кабінета ў жаночай кансультацыі было шматлюдна. Вырашылі: каб не губляць час, я буду трымаць чаргу, а жонка пакуль пройдзецца па іншых кабінетах. І вось я баўлю час у кампаніі цяжарных прыгажунь, разглядваючы плакаты-памяткі для будучых бацькоў. «Хто крайні на УГД?», — чую голас за спінай. Маё «Я!» збянтэжыла парадзіху так, быццам я ўламіўся ў жаночую лазню ці памылкова заняў чаргу ў жаночую прыбіральню. Спачатку яна паглядзела на мяне, потым на мой жывот, з нямым пытаннем «Як гэта разумець?» абвяла вачыма прысутных. Каб зняць напружанне, прыйшлося патлумачыць, што чаргу трымаю для жонкі. Толькі пасля гэтага яна выдала традыцыйнае «Тады я за вамі» і размясцілася на вольным крэсле. Без жывата ў гэтай суполцы я быў чужак, таму, калі праз паўтары гадзіны прыбегла наш час, астатнія уздыхнулі з палёгкаю.

Па той бок дзвярэй да жадання бацькі прысутнічаць на ўльтрагуку паставіліся з большым аптымізмам. Прыветлівая жанчына хутка растлумачыла, дзе сядзець мне, дзе і як ляжаць жонцы, і ўзялася за справу. Спачатку яна называла пад запіс напарніцы зразумелыя толькі ёй лічбы, сярод іх бацькоўскае вуха цешыла запаветнае слова «норма». Выканаўшы сваю працу, яна павярнула манітор у наш бок. Нават не ведаю, з чым параўнаць гэты момант... Дакладна я менш хваляваўся, калі шукаў сваё прозвішча ў спісе залічаных ва ўніверсітэт. Уявіце: увесь напружаны, ты чакаеш знаёмства з новым жыццём, а бачыш незразумелую мешаніну на чорна-белым экране... Ты нават не паспяваеш як след засмуціцца, як нацiскаюцца нейкія кнопкі, і вывва сплывала рэзкай. Фух... Кіно будзе! Малеча, быццам разумеючы, што за ёй назіраюць, адразу сарамліва прыкрывае твар ручкамі. Так, галоўка, вушкі — усе на месцы. Спускаемся ніжэй. Галоўная інтрыга паказу... Хвіліна маўчання змяняецца пытаннем медыка: «Ну што тата, бачыце?». Паколькі разгледзець нешта канкрэтнае на экране было немагчыма, уключаю логіку: «Раз павінен убачыць, значыць, усё ж такі нешта адметнае там ёсць...». Усё зразумела. Зрабіўшы нескладаныя высновы, не вельмі ўпэўнена, але не без гонару ў голасе выдаю: «Гэта хлопчык...». На твары доктаркі з'яўляецца ўсмешка: «Вось усе мужчыны так адказваюць. Не, віншую: у вас будзе дзяўчынка!».

АПРЫТОМНЕЎ, калі зноў вярнуліся ў калідор. Жонка ўжо па тэлефоне расказвае галоўную навіну родным. Таксама ўключаюся ў сістэму тэрміновага паведамлення. «Цудоўна!» — рэзюмуе цесць, калі чарга даходзіць да яго. Пасля чаго дадае: «Гэта 100 працэнтаў? А то неадночы чуў, што здараюцца памылкі...»

У нашым выпадку памылкі не было. Яшчэ праз 20 тыдняў нарадзілася дачка. Сёння ніхто нават не ўяўляе, што магло б быць інакш. Сапраўды, па-іншаму не было б, нават калі б нарадзіўся хлопчык. Бо бацькоўскае шчасце не залежыць ад полу дзіцяці. Дзіця — гэта ж і ёсць шчасце.

**Аляксандр АЛЕСІК.**

■ Фотаздымак з гісторыяй

# «ЗА НОВЫЯ БУДОЎЛІ...»



«Гэта выпускнікі першага пасляваеннага набору на будаўнічы факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута па спецыяльнасці «Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва» (1945 год). З перамогай завяршылася Вялікая Айчынная вайна. Убачылі доўгачаканае мірнае неба. Ажываюць развалiны роднага Мінска. Беларускі політэхнічны аб'явіў першы пасляваенны набор студэнтаў. Мы паступілі і прыйшлі ў інстытут на заняткі, а вучыцца няма дзе: навучальныя корпусы, інтэрнаты, бібліятэка былі разбураны. Лекцыі чыталіся ў розных месцах горада: ва ўцалелых будынках Інстытута фізічнай культуры, сярэдняй школы і ў старым доме на плошчы Свабоды.

Паступова адбудавалі галоўны корпус, інтэрнаты, бібліятэку, лабараторыі, з'явіліся аўдыторыі. У аднаўленні інстытута бралі ўдзел і студэнты. Многія былі ўдзельнікамі вайны. Яны былі апрануты ў франтавыя шынялі, замест партфеляў — армейскія палявыя сумкі.

У 1950 годзе мы ўсе закончылі інстытут і сталі інжынерамі-будаўнікамі, у якіх была вялікая патрэба для краіны, каб адбудаваць разбураныя гарады і вёскі.

Размеркаванне выпускнікоў было ўсесаюзнае, і мы раз'ехаліся па Савецкай краіне. Некага пакінулі ў Мінску, некага адправілі на Крайнюю Поўнач, Далёкі Усход і поўдзень.

Першая сустрэча выпускнікоў будаўнічага факультэта адбылася праз 20 гадоў у 1970 годзе. Мы ўжо сталі вопытнымі высокакваліфікаванымі спецыялістамі: хто галоўным інжынерам, хто начальнікам будупраўлення ці кіраўнікамі трэста, іншыя займалі адказныя пасады ў міністэрствах.

Колькі было пабудавана нашымі выпускнікамі заводаў, прамысловых прадпрыемстваў, жылых дамоў, грамадскіх збудаванняў, жывёлагадоўчых памяшканняў у калгасах і саўгасах Савецкай краіны — цяжка падлічыць. Як прыемна было сустрэцца і расказаць пра сябе і даведацца пра іншых!

Сярод нашых выпускнікоў ёсць і вучоныя. Напрыклад, Сабалеўскі Юрый Аляксандравіч (чацвёрты злева направа ў першым радзе) — доктар тэхнічных навук, прафесар кафедры інстытута, аўтар праекта будаўніцтва Мінскага метрапалітэна, заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь, удзельнік вайны. Яму на яго радзіме ў Віцебскай вобласці пастаўлены бюст (у глыбоцкім скверы). Кандыдаты тэхнічных навук (у апошнім радзе, злева направа) Жазніцкі, Барташэвіч і Шайтараў працавалі дацэнтамі кафедраў. Я — Іван Адамавіч Апанасевіч — заслужаны настаўнік (другі справа ў трэцім радзе).

У завяршэнні сустрэчы прагучалі такія тосты: "За нашую Вялікую Перамогу над нацысцкай Германіяй і за наш родны Мінск, і наш інстытут, і за новыя будоўлі і новыя сустрэчы..."».

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі з гісторыяй (не больш за тры) дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а, або info@zvyazda.minsk.by. Аўтар найлепшага фота з гісторыяй будзе адзначаны прызам. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца аўтарам.***

■ Мама, пачытай!

# ДЗЯЎЧЫНКА І КАЛАБОК

Плаксы прыходзілі да Янaчкі па вечарах, як толькі дзяўчынка ўкладвалася спаць. Худыя, з зялёнымі доўгімі нагамі і касматымі бровамі, яны рабілі страшныя тварыкі, палохалі і даводзілі малую да слёз.

Тады да яе падыходзіла бабуля, брала на рукі, гладзіла па кучаравай галаве і спявала песеньку пра непаслухмянага Калабка, пра яго падарожжа з прыгодамі: «Я ад бабы ўцёк, я ад дзеда ўцёк...» У пакоі адразу запанoўваў спакой. Плаксы кудысьці знікалі, а Янaчцы ўяўляўся румяны Калабок, які танцаваў пад вясёлую песеньку на сваіх маленькіх ножках. Ён нёс яе ў казачную краіну і хаваў там ад касматых і назойлівых Плаксаў. Янaчка падпявала Калабку і яны, узяўшыся за рукі, беглі на рамонкавы луг і сустракалі свайго вернага сябра — Сонечны Світанак! Ранішнія птушкі прыносілі ім зерне, салодкую расу і спявалі надзвычай прыгожыя песні...

Калі дзяўчынка прачыналася, Калабок і яго казачная краіна знікалі. Янaчцы зноў успаміналіся страшныя вячэрнія Плаксы, якія — добра памятала — хаваліся дзесьці там, па цёмных кутах. І яна зноў пачынала хныкаць.

Аднойчы ёй падумалася: «А што, калі папрасіць бабулю спячы сапраўднага Калабка, каб ён з'явіўся не толькі ў сне, але і быў са мной увесь дзень?»

Бабуля з радасцю пагадзілася. Як у казцы, па засеках паскрэбла, цеста замясіла, балабушку зляпіла і паставіла ў духоўку. Янaчка, прысеўшы на кукішкі, зачаравана назірала, як за шклом духоўкі расце і дыхае яе добры казачны сябар. Нарэшце, піражок стаў падобным на шарык і зарумяніўся.

— Ну вось, — сказала радасна бабуля, — Калабок і гатовы, сядай за стол!

Яна адкрыла духоўку і дастала духмяны Калабок.

— Крыху пачакаем, каб ён астыў, — працягвала бабуля, — паліем яго смятанай і будзем каштаваць.

Бабуля пайшла па смятану, а Янaчка, не адрываючы вачэй, глядзела на доўгачаканага Калабка. І раптам ён расплюшчыў вочкі, ускочыў на маленькія ножкі — і давай скакаць і спяваць проста на стале:

«Я ад бабы ўцёк!
Я ад дзеда ўцёк!
Затое Янaчку знайшоў —
У госці да Янaчкі прыйшоў,
Песні Янaчцы спяю
І з сабою забяру —
Проста ў казку павяду!».

Янaчка смяялася і падпявала Калабку. З ім было весела і цудоўна! І тут яна падумала: «Я ж прасіла ў бабулі спячы Калабка для таго, каб з ім сябраваць. Хто ж будзе па начах праганяць страшных Плаксаў?» — і Янaчка падмiргнула Калабку і працягнула рукі. Дзяўчынка паклала румянага сябрука ў кішэню і неўпрыкметку выслізнула за дзверы...

Прыйшла бабуля, прынесла смятану, зірк — а ў пакоі ні ўнучкі, ні Калабка. І тут яна пачула вясёлую песеньку. Зірнула ў акенца, а там Янaчка з Калабком танцуюць і спяваюць, скачуць, у даганялкі гуляюць. Убачылі гэта і страшныя касматыя Плаксы, што ўдзень хаваліся па кутах ад вачэй людскіх. Гучна закрычалі, хацелі Янaчку напалохаць. Толькі дзяўчынка ў іх бок і не зірнула. Тады Плаксы зразумелі, што Янaчка ніколі больш не будзе іх баяцца і плакаць па начах. Сабралі яны свае манаткі і памяліся са двара — шукаць іншую дзяўчынку або хлопчыка. Глядзіце, дзеткі, каб яны не зазірнулі ў вашы дамы!

**Ларыса КАРАСІНА.**

■ Захапленне для ўсіх

# Фарба з цвікоў і капуснага расолу

## Пра сапраўдныя пісанкі і абярэгі на ўсе выпадкі

**Народныя майстры заўсёды вылучаліся ўменнем ператвараць самыя простыя рэчы ў аб'екты мастацтва. У іх руках нават звычайнае яйка становіцца музейным экспанатам. У прамым сэнсе. Непадалёк ад Вілейкі, у вёсцы Ізбіно, працуе адзіны ў Беларусі Музей яйка. За дзевяць гадоў мясцовая калекцыя (яе папаўняюць як майстры раённага Дома рамёстваў, так і госці) вырасла да 500 экспанатаў.**




Тут можна пабачыць розныя тэхнікі: акрамя тыповых пісанак, на паліцах стаяць драўляныя муляжы, упрыгожаныя разьбой, саламяным пляценнем, каляровымі партрэтамі і пейзажамі. Ёсць і каменнае яйка — падарунак студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, якія некалі прыязджалі ў Вілейку на скульптурны пленэр.

Некалі ў кожным рэгіёне яйкі распісвалі пасвойму. Напрыклад, на поўдні нашай краіны іх рабілі рознакаляровымі, як у суседняй Украіне. Фарбы — толькі з натуральных інгрэдыентаў: шалупінне цыбулі, лісце бярозы, кара дуба і вольхі. Нашы продкі маглі прыгатаваць фарбу нават з кіслага капуснага расолу і ржавага цвіка! У арнамент на яйках закладваўся пэўны сэнс. Маленькія штрыхі ўверсе сімвалізавалі дождж, кропкі ўнізе — насенне, якое павінна ўзысці. Такі ўзор быў папулярны ў засушлівых рэгіёнах. Для роспісу таксама часта выкарыстоўвалі салярныя знакі.

Чаму столькі ўвагі менавіта яйку? **Дырэктар Вілейскага раённага дома рамёстваў Ксенія АЛЬФЕР** расказала, што з дахрысціянскіх часоў яно ўвасаблялa народныя ўяўленні пра жыццёвыя сілы прыроды. Старажытныя славяне ўключалі яйкі ў веснавыя абрады як сімвал яе абуджэння пасля зімовага сну, сведчанне чалавечага дабрабыту. Так, на Вілейшчыне да XX стагоддзя бытаваў звычай на першы выган скаціны ў поле перад парогам хлява закопваць яйка. Калі жывёла пройдзе, а яно застанецца цэлым — добрая прыкмета: усё лета каровы і козы будуць здаровыя. Пастухам жа раілі трымаць за пазухай першае яйка ад чорнай курыцы: тады ваўкі не нападуць на скаціну. Згодна з беларускай народнай традыцыяй, яйка — яшчэ і сімвал пладавітасці. Калі нявеста выходзіла з царквы, хтосьці з родных разбіваў сырое яйка — так дзяўчыне зычылі лёгкіх родаў і шмат дзяцей.

З прыходам хрысціянства асабліва шанавацца сталі велікодныя яйкі. Яны захоўваліся на покуці за абразамі (увогуле лічылася, што пісанкі нельга выкідваць — толькі закопваць) і былі абярэгамі на цэлы год. Калі ў сям'і хтосьці цяжка хварэў, яму давалі патрымаць асвячонае яйка. Нашы продкі верылі, што пасля гэтага чалавек пражыве як мінімум да наступнага Вялікадня. Асвячонае яйка з'яўлялася талісманам на ўсе выпадкі. З'ясі яго разам са шкарлупінай перад тым, як ісці ў лес, — і не заблудзішся. Хочаш быць здаровым — памыйся на Вялікдзень у вадзе, у якую пакладзена «свянцонка». А каб быў добры ўраджай, шалупайку велікоднага яйка трэба было пакласці ў першую баразну.

Раней пісанкі, якія рабілі не толькі да Вялікадня, але і на працягу астатняга года, дарылі блізкім людзям. Яйка, атрыманае хлопцам ад дзяўчыны, — знак увагі і сімпатыі.

У музеі на Вілейшчыне плануюць пашыраць калекцыю і аднаўляць старажытныя ўзоры. Дарэчы, асвоіць «яйкавы» роспіс можа любы ахвотны: тэхніка нескладаная, а мясцовыя ўмельцы ў Доме рамёстваў рэгулярна праводзяць майстар-класы, якія будуць цікавыя і дарослым, і дзецям. Якраз да наступнага Вялікадня паспееце дасканала авалодаць майстэрствам. Музей працуе ўсе дні, акрамя нядзелі, з 8 да 17 гадзін. Уваход бясплатны.



**Авалодаць майстэрствам роспісу па яйку пад сілу кожнаму.**

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

*У народзе кажуць: «ПАЦЕЙ, МАЦЕЙ, КАЛІ МНОГА ДЗЯЦЕЙ»*

**Адказная за выпуск Надзея ДРЫЛА.**

# ЖЫЛЫ ДОМ АКАЗАЎСЯ... ІНТЭРНАТАМ

## У Магілёве статус будынка стаў прычынай канфлікту паміж жыхарамі і мясцовай уладай

**Скандал разгарэўся вакол двухпавярховіка па вуліцы Ленінскай, 59. Да мінулага года там жылі 13 сем'яў. Летась дом быў прызнаны аварыйным і жыхароў папярэдзілі пра адсяленне. Праўда, калі яны даведаліся, што замест асобнага жылля ім «свецяць» інтэрнацкія пакоі, пераязджаць добраахвотна адмовіліся. І тады балансаўтрымальнік — будтрэст №12 — звярнуўся ў суд, каб жыхароў выселілі прымусова. Зараз яны жывуць у розных інтэрнатах, але здавацца не збіраюцца. На працягу года аспрэчвалі судовыя рашэнні, але безвынікова. І тады частка з іх аб'явіла галадоўку. На крайні крок пайшлі некалькі сем'яў, якія зараз жывуць у інтэрнаце па вуліцы Піянерскай — якраз насупраць свайго былога дома.**

### ОРДЭР БЕЗ ПРАВА НА КВАТЭРУ?

На новым месцы жыхарства да вымушаных навасёлаў ставяцца са спачуваннем. Яны ж не ад добрага жыцця пайшлі на канфлікт.

«А, вы да галадаючых? — зразумела дзяўчына, калі я заблукала ў інтэрнатаўскіх калідорах і папрасіла падказаць дарогу ў патрэбны пакой. — Вунь іх дзверы, заходзьце».

Гаспадыня была не супраць падзяліцца набалелым. Яна з мужам і сынам жыве ў гэтых сценах ужо год, але яны так і не сталі для іх роднымі. Пакой цалкам застаўлены мэбляй, на шафе ляжаць чамаданы, здаецца, што гаспадары сабраліся кудысьці пераязджаць. «Не звяртайце ўвагі, — абыякава махае рукой на неўладкаванасць Наталля Машкоўская. — Раней у нас было 50 квадратаў жылой плошчы, а зараз усяго 19. Так што жывём у паходных умовах». Жанчына адразу запрашае падняцца ў пакой паверхам вышэй, дзе жывуць Наталля Кастагладава з дачкой Алёнай — яе залвіца з пляменніцай. «Яна пакажа ўсе дакументы, каб вы не думалі, што мы нейкія там самазванцы, імкнёмся нешта ўрваць».

Наталля Кастагладава і сапраўды з гатоўнасцю дэманструе мне папку са стосам афіцыйных лістоў. Першыя спробы адсяліць жыльцоў, кажа яна, рабіліся яшчэ 6 гадоў таму. Менавіта тады і паляцелі іх скаргі ў розныя інстанцыі. Чыноўнікі рэагавалі на праблему па-рознаму. Адны спачувалі і абяцалі перасяліць у кватэры, іншыя ніякіх абяцанняў наогул не давалі. Будтрэст таксама не вельмі быў паслядоўным у сваіх паводзінах. Спачатку там казалі, што дадуць жыллё, а потым, калі пагоршылася сітуацыя ў эканоміцы, прынялі нечаканае для жыхароў рашэнне — ніякіх кватэр, толькі інтэрнат.

Галоўны козыр жыхароў адселенага дома — гэта менавіта ордэры. Сам будынак, статус якога стаў каменем разладу, назваць жылым домам можна хіба што з нацяжкай. Хутчэй барак з прыгожым фасадам. Галоўная яго прывабнасць у тым, што ён знаходзіцца ў цэнтры горада. А вось астатняе... Мяркуйце самі. Дом 1952 года пабудовы практычна не меў выгод: прыбіральня на вуліцы, ніякіх душавых пакояў, замест паўнавартаснага санвузла звычайныя ўмывальнікі на 1-м і 2-м паверхах. Нават кухні толькі ўмоўныя, паколькі газ быў не падведзены і жыхары карысталіся балонамі. І пры ўсім гэтым ордэры, дзе пазначаны нумары не пакояў, а менавіта кватэр. Гісторыя насамрэч заблытаная. Але факт застаецца фактам. З 13 сем'яў, якія жылі ў доме №59 па Ленінскай, 7 валодаюць гэтымі сур'ёзнымі дакументамі.

— У 2009 годзе мы адпраўлялі копіі сваіх ордэраў у Мінжылкамгас і нам паведамілі, што гэта не дае магчымасці ўстанавіць, які статус мае займаемае памяшканне — інтэрната або жылой кватэры. Аднак, падкрэслілі яны, ордэр быў выдадзены як на кватэру, — паказвае афіцыйны адказ Наталля.

**Спачатку ў будтрэсце казалі, што дадуць жыллё, а потым, калі пагоршылася сітуацыя ў эканоміцы, прынялі нечаканае для жыхароў рашэнне — ніякіх кватэр, толькі інтэрнат.**

— Чаму ж вы не прыватызавалі сваё жыллё, або не паспрабавалі яго змяніць на нешта лепшае? — пытаюся ў жанчыны.

— У 1977 годзе мы падалі на пашырэнне, але сабраць патрэбныя дакументы не атрымалася, — адказвае яна. — У будтрэсце сказалі: у вас ужо ёсць жыллё, метраў хапае, вось і карыстайцеся. Пры гэтым быў перыяд, калі дазвалялася пашыраць свае ўладанні за кошт пакояў з'ехаўшых суседзяў. А дакументы на паляпшэнне жыллёвых умоў стала магчымым узяць толькі... у 2013 годзе. Да гэтага часу лічылася, што мы жывём у жылым доме, але з частковымі выгодамі.

Валянціна і яе дзеці, як і ўсе іншыя заложнікі сітуацыі, лічаць, што іх заведама паставілі ў горшыя ўмовы. «За гэтыя пакоі мы плацім не менш, чым за кватэру, — абураецца Наталля Машкоўская. — Па 700-800 тысяч рублёў за месяц! Толькі за электраэнергію набягае круглая сума. З нас вылічваюць грошы за 347 кілават! Адкуль бярэцца такая лічба, мы не ведаем. Гэта ж інтэрнат, тут лічыльнік адзін на ўсіх. У параўнанні з тым, што плацілі на ранейшым месцы пражывання — гэта неба і зямля. Але мы тэрмінова разлічваемся, каб не страціць і гэтае жыллё. Хаця па пашпартах дагэтуль жывём па ранейшым адрасе — вуліца Ленінская, 59.


5 дзён толькі на вадзе.

### Каментарый да тэмы

На жаль, каментаваць падзеі ў будтрэсце №12 адмовіліся. Таму лёс жыхароў і іх былога дома карэспандэнт «Звязды» высвятляла ў **старшыні Магілёўскага гарвыканкама Уладзіміра ЦУМАРАВА.**

— Людзі палічылі, што суды Ленінскага раёна і вобласці прынялі няправільнае ў адносінах да іх рашэнне, — кажа ён. — Ім растлумачылі, што тыя дзеянні, якія былі праведзены, законныя. Дамовіліся, што дагавор найму жылля будзе заключаны з імі на бестэрміновы перыяд.

— А што чакае гэты дом?

— Гэта аварыйная пабудова, і ў перспектыве яе чакае знос. А вось як будзе выкарыстоўвацца пляцоўка, дзе яна знаходзіцца, яшчэ трэба вызначыць. Месца цэнтральнае, яно будзе запатрабавана.


Фасад у дома сімпатычны.

З папкі, дзе акуратна складзена ўсё, што датычыцца злашчаснага дома, яна дастае пажоўклую паперу з пячаткай — той самы ордэр. У 1972 годзе яго атрымаў яе бацька — Станіслаў Машкоўскі. І там пазначана, што яго сям'і прадастаўлена жылая плошча 15,36 квадратнага метра. Падставай для выдачы ордэра стала, як сведчыць дакумент, рашэнне Кастрычніцкага райвыканкама. У 90-х, калі бацька Наталлі быў асуджаны, асабовы рахунак пераафармілі на дачку. І ў афіцыйнай выпісцы таксама згадваецца не пакой у інтэрнаце, а кватэра ў жылым доме.

— У інтэрнатах нічога не пераафармляецца, усе застаюцца жыць, як і жылі, — лічыць Наталля. — Мы толькі летась у судзе даведаліся, што гэта інтэрнат. Але мае бацькі атрымлівалі ордэр на кватэру, а не на нейкае часовае жыллё. Я тут нарадзілася і пражыла 39 гадоў. Няўжо, калі б гэта быў інтэрнат, я сабе жыллё не пабудавала б?

Валянціна Батура таксама са старажылаў. Яе свёкар атрымаў жыллёвую плошчу ў доме на Ленінскай яшчэ ў 1957 годзе. Потым на гэтых жа квадратах прапісалася Валянціна і яе дзеці.

### ЦІ МАГЧЫМЫ КАМПРАМІС?

Юрысты ЖКГ тлумачаць, што выпадкі, калі людзі прыходзяць да іх з ордэрамі савецкага ўзору на жыллёвую плошчу ў інтэрнаце, а дом пры гэтым прызнаны жылым, не рэдкасць. Ім дапамагаюць пераафарміць дакументы. А вось каб даказаць, што жыхар мае «кватэру» ў інтэрнаце, трэба бачыць рашэнне, на падставе якога яму выдаваўся ордэр. У Магілёве ёсць інтэрнаты, якія часткова з'яўляюцца жылымі дамамі. Але ўсе яны прайшлі праз працэдуру пераводу іх у такі статус. Прычым адбылося гэта толькі тады, калі былыя памяшканні пераабсталявалі ў адпаведнасці з нарматывамі. Каб яны сапраўды адпавядалі статусу кватэры.

На жаль, у судзе не знайшлося ніводнага дакумента, які б пацвердзіў, што дом па вуліцы Ленінскай, №59 ці асобныя яго пакоі калісьці мелі такі статус. А без гэтага сцвярджаць, што ордэр дае права на атрыманне асобнага жыллёвага памяшкання, нельга.


А вось «выгоды» былі на вуліцы.

— Дом, дзе яны жылі, адназначна інтэрнат, — нават не сумняваецца **намеснік старшыні суда Ленінскага раёна**, дзе разглядалася справа, **Валянціна ЛАПАЦІНА**. — Гэта пацвярджаецца рашэннем Магілёўскага гарсавета дэпутатаў працоўных ад 22 верасня 1951 года. Яно сведчыць, што зямельны ўчастак адводзіўся для будаўніцтва не жылога дома, а менавіта інтэрната. Ёсць таксама дакумент Агенцтва па дзяржрэгістрацыі і зямельным кадастры (былога БТІ) са спасылкай на тэхнічны пашпарт гэтага дома ад 28 снежня 1952 года, дзе ён пазначаны як інтэрнат. У матэрыялах справы маюцца план інтэрната, характарыстыкі памяшканняў, інвентарная картка ўліку асноўных сродкаў трэста на 1 мая 1957 года з Дзяржархіва Магілёўскай вобласці. І ніводны дакумент не пацвярджае, што гэта быў жылы дом. Як яго наогул можна лічыць такім, калі на ўвесь паверх мелася адна кухня, а прыбіральня была на вуліцы?

Але ж жыльцы сцвярджаюць, што ордэр дае ім права ўласнасці на тыя метры, якія яны займалі. Маўляў, ім нават даведкі не выдавалі на паляпшэнне жыллёвых умоў. Казалі, што метражу хапае. Права ўласнасці павінна быць зарэгістравана ў Агенцтве па дзяржрэгістрацыі і зямельным кадастры. Калі будтрэст не даваў даведку на паляпшэнне жыллёвых умоў, трэба было звярнуцца ў суд і аспрэчыць яго рашэнне. Гэта дало б ім права стаць на ўлік і атрымаць нармальнае жыллё замест таго, якое ў іх было. Зараз у іх няма дакумента, які б пацвердзіў права ўласнасці на гэтае жыллё. І іх довады застаюцца галаслоўнымі.

Наогул, па гэтым доме адбылося 11 судоў, з некаторымі жыхарамі было заключана міравое пагадненне і яны выселіліся добраахвотна. Яшчэ некалькі сем'яў абскардзілі судовае рашэнне ў парадку нагляду ў абласным судзе. Але і там прыйшлі да высновы, што падставы для выдзялення кватэр няма.

Тым не менш, кропку ў справе пакуль ставіць рана. На мінулым тыдні да жыхароў злашчаснага дома прыйшлі прадстаўнікі мясцовай улады і будтрэста №12, каб разам знайсці нейкі кампраміс. З людзьмі пагутарылі і паабяцалі яшчэ раз разгледзець іх пытанне. Тыя ў адказ згадзіліся прыпыніць галадоўку. Прадстаўнікі будтрэста прапанавалі жыхарам заключыць бестэрміновыя дагаворы найму, з боку выканаўчай улады агучваўся варыянт з арэндным жыллём. Але якое канчатковае рашэнне будзе прынята ў адносінах да жыхароў дома №59 па вуліцы Ленінскай, пакуль не вядома. «Звязда» будзе і далей сачыць за развіццём падзей.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара**


**Извещение о проведении 29 июня 2015 г. аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для индивидуального жилищного строительства в Чернавчицком сельском Совете Брестского района**

| № лота | Предмет аукциона | Площадь га | Начальная стоимость земельного участка (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) | Целевое назначение земельного участка | Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, убытки (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок в аг. Чернавчицы, ул. Южная, 15 А, 121284608601000913 | 0,1265 | 150 000 000 | 15 000 000 | строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома | 1. 10 927 463 – за изготовление документации и регистрацию участка; 2. оплата за объявления по актам выполненных работ |

По улице Южной в аг. Чернавчицы централизовано проходят сети газоснабжения, водоснабжения, водоотведения.

**Аукцион будет проводиться 29.06.2015 в 10.00 по адресу: Брестский район, аг. Чернавчицы, ул. Сикорского, 22 (здание сельисполкома).**

Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Чернавчицкого сельисполкома № 3600213110108 в филиале № 100 БОУ АСБ «Беларусбанк», МФО 246, УНП 200036594, код платежа 4901 залога в размере 10% от начальной цены земельного участка, документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения, осуществляется победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: аг. Чернавчицы, ул. Сикорского, 22 (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений – **23 июня 2015 года до 17.00.**

Контактные телефоны: 94 51 35, 94 51 36


## ПАЖАРЫ АД РАЗРАДАЎ МАЛАНКІ

**Увечары мінскім выратавальнікам паступіла паведамленне пра пажар у будынку на тэрыторыі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і быту ў вёсцы Азярцы.**

На месцы падраздзяленні ўбачылі, што адкрытым полымем гарыць дах музейнага экспаната «Гумно». Пажар аператыўна ліквідавалі, але ў будынку агонь паспеў пашкодзіць саламяны дах і драўляныя сцены. Разглядаюцца тры версіі здарэння: падпал, навальнічны разрад маланкі, неасцярожнае абыходжанне з агнём неўстаноўленай асобы.

А ўжо ўначы сталінскія выратавальнікі выязджалі на пажар капліцы ў вёсцы Сіцік — драўлянага будынка, пабудаванага ў XIX стагоддзі. У выніку пажару капліца была знішчана агнём. Мяркуецца, што прычынай бяды стаў разрад маланкі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа 5/2, офис 1703 |
| **Продавец** | **ОАО «СТАНКОСТРОИТЕЛЬНЫЙ ЗАВОД им.С.М.КИРОВА»,** г. Минск, ул. Красноармейская, д. 21 |

**Предмет аукциона (производственная база, расположенная по адресу: Минская обл., Крупский р-н, гп. Холопеничи, ул. Кирова, 2)**

| Наименование | Инвентарный номер | Общая площадь, кв.м | Назначение |
|---|---|---|---|
| **Пластмассовый цех** | 613/С-9190 | 1445,2 | Здания специализированные складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ |
| **Склад металлический** | 613/С-11911 | 80,2 | |
| **Здание открытого склада** | 613/С-9187 | 93,8 | |
| **Здание складских помещений** | 613/С-9188 | 395,2 | |
| **Здание компрессорной** | 613/С-9185 | 265,7 | |
| **Механический участок** | 613/С-9184 | 717,0 | Здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения) |
| **Здание магазина** | 613/С-9l86 | 53,8 | Здание специализированное розничной торговли |
| **Растворно-бетонный узел** | 613/С-11901 | 244,1 | Здания неустановленного назначения |
| **Здание котельной** | 613/С-9189 | 400,8 | |
| *Составные части и принадлежности котельной: дымовые трубы 2 шт. | | | |
| **Проходная** | 613/С-11904 | 14,1 | Здание неустановленного назначения |
| *Составные части и принадлежности проходной: ограждения (металлическое 276 м и бетонное 966 м), покрытие (асфальт 2038 кв.м) | | | |
| **Трансформаторная подстанция** | 613/С-11906 | 105,1 | Здание специализированное энергетики |
| *Составные части и принадлежности ТП: кабельные сети (572,7 м), воздушные сети (583,9 м), опоры бетонные 15 шт. | | | |
| **Теплица зимняя** | 613/С-11905 | 1595,1 | Здание специализированное растениеводства |
| *Составные части и принадлежности теплицы: тепловой пункт, склад | | | |
| **Открытая площадка для складирования с подкрановыми путями** | 613/С-11909 | - | Сооружение специализированное складов, хранилищ |
| **Водонапорная башня** | 613/С-12503 | - | Сооружения специализированные водохозяйственного назначения |
| **Емкости для системы оборотного водоснабжения** | 613/С-11907 | - | |
| *Составные части и принадлежности емкостей: колодец, ограждение емкостей | | | |
| **Наружные сети канализации с КНС** | 613/С-11900 | - | Сооружения специализированные водохозяйственного назначения |
| **Наружные сети водопровода** | 613/С-11899 | - | |
| *Составные части и принадлежности наружных сетей водопровода: насосная станция, артезианская скважина | | | |
| **Теплотрасса** | 613/С-11902 | - | Сооружение специализированное коммунального хозяйства |

**Зеленые насаждения:**

| Наименование | Инвентарный номер согласно бухучета | Количество, штук |
|---|---|---|
| **Многолетние насаждения из дуба и хвойных пород** | 34012 | 6 |
| **Плодовые насаждения косточковые** | 34013 | 9 |
| **Кустарники** | 34014 | 39 |
| **Многолетние насаждения из других пород** | 34011 | 40 |

**Начальная цена с НДС 20% – 10 461 431 575 белорусских рублей.**

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке:** | Для обслуживания зданий и сооружений производственной базы продавцу предоставлен на праве постоянного пользования земельный участок пл. **3.3894 га.** |

**Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».**

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи:** | **15** рабочих дней после проведения аукциона. |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи.

